№ 15 (517) 27 красавіка 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## У НУМАРЫ

**Ельцын**

Словы на разьвітаньне зь першым дэмакратычна абраным кіраўніком Расеі за шэсьцьсот гадоў.
**Старонка 3.**

**Сідорскі прызнаў праблемы ў эканоміцы**

І назваў першы квартал 2007 году «цалкам правальным».
**Старонка 4.**

**Такая вось любоў...**

Пасьля таго, як «Наша Ніва» выйшла з загалоўкам на першай паласе «Клён Фінькевіча», адміністрацыя «хіміі» зьбіралася сьсекчы тое дрэва. Артура Фінькевіча наведаў карэспандэнт «НН».
**Старонка 5.**

**Вера Рыч**

Перакладчыца Коласа й Купалы на ангельскую мову наведала Беларусь.
**Старонка 30.**

## Вырашэньне непасільных задачаў

Пасланьне А.Лукашэнкі нацыянальнаму сходу было вытрымана ў ранейшым тоне.

24 красавіка Аляксандар Лукашэнка выступіў з традыцыйным веснавым пасланьнем народу і парлямэнту. Фактычна ў кожнай сфэры — ад нафтахіміі да спорту — кіраўнік дзяржавы запатрабаваў мабілізацыі і кантролю. Самымі частотнымі словамі ў дакладзе былі «павінны, абавязаны, трэба». Часам А.Лукашэнка жартаваў, але ў цэлым выглядаў даволі ўзьвінчаным.

Даклад доўжыўся трохі меней за дзьве гадзіны і ні разу не перарываўся воплескамі.

Старонка 6.




# Цяжкасьці эвалюцыі

**Зь Вільні нядаўна прыйшло паведамленьне, што лідэры дэмакратычных сілаў дамовіліся памяняць агульную стратэгію. А менавіта — перайсьці ад рэвалюцыйных мэтадаў да эвалюцыі і дыялёгу з уладай. Калі так, дык ці азначае гэта, што дагэтуль беларуская дэмакратычная апазыцыя йшла рэвалюцыйным курсам?.. Піша Віталь Тарас. Старонка 10.**

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Барыс Ельцын і Сьвятлана П.

Расея разьвіталася зь першым за сваю шасьцісотгадовую гісторыю дэмакратычна абраным кіраўніком. Пахавала даволі абыякава. Лічаныя тысячы людзей прыйшлі разьвітацца з былым кумірам. Не параўнаць з тым, як беларусы хавалі Быкава.

Тое, што Ельцын быў першым прэзыдэнтам у краіне, якая раней ведала толькі абсалютных манархаў і генсекаў, многае тлумачыць як у абыякавасьці разьвітаньня, так і ў манеры кіраваньня таго, каго адпявалі. Аднак чаму Ельцын, які мог лёгка перавесьці ўсё да звыклага працягу папулісцкай тыраніі, як тое зрабілі некаторыя ягоныя калегі, выбраў, урэшце, іншы шлях?

«Якая сіла вяла клясычнага савецкага мэнэджэра, тыповага рэгіянальнага партработніка, які меў грубаватыя манеры практыка-гаспадарніка з вытворчага раману, да таго, каб зьмяніць краіну, уклад якой здаваўся непарушным і вечным? Зьбег абставінаў, інтуіцыя, сэрца?» — задае пытаньні расейскі камэнтатар Андрэй Калесьнікаў.

Больш чым выпадак, інстынктыўная прага ўлады ці эмоцыя, думаю, Ельцына вяло цьвёрдае, вынашанае перакананьне. Ягоны дзед быў раскулачаны, бацька рэпрэсаваны, сам Ельцын, як сотні савецкіх людзей, здолеў вырваць для сябе вышэйшую адукацыю толькі таму, што прыхаваў сямейную біяграфію. Дзяцінства, першы выхад у людзі, жыцьцёвыя ўнівэрсытэты, як сфармуляваў Горкі, тры пункты, якія фармуюць сьветапогляд назаўжды.

Такія, як Ельцын, былі ў кампартыі, нават сакратарамі, бо была ў іх энэргія і розум, а дарога да самарэалізацыі, а часам проста самазахаваньня, ішла праз партыю. Яны прымалі правілы гульні, але ведалі: во паўпраўда, прапаганда, а тое — чысты падман. А вось гэтае: раскулачаны дзед, рэпрэсаваны бацька, бяспраўнае юнацтва ёсьць праўдай савецкае гісторыі. Таму Ельцын з палёгкай прайшоў праз пераацэнку каштоўнасьцяў і пры першым выпадку паквітаўся зь бесчалавечнай сыстэмай, ад якой так пацярпела ягоная сям’я.

Сьветапогляд Ельцына быў сфармаваны яго сямейным вопытам, але і той адукацыяй, якую ён атрымаў, і грамадзтвам, да якога належаў. Рэформы Ельцына кантраставалі з рэформамі Гаўла настолькі, наколькі розьніліся грамадзтва Расеі й Чэхіі і адукацыя лідэраў, выштурхнутых наверх хваляй перавароту. І, на выхадзе з рэформаў, багацьце сям’і Гаўла і багацьце сям’і Ельцына.

...Празь некалькі гадзінаў пасьля сьмерці першага прэзыдэнта Расеі ў сталіцы Беларусі затрымалі чатырох хлопцаў і адну дзяўчыну. Быццам бы яны расклейвалі налепкі «Чарнобыльскага шляху» на мосьце між Маскоўскім і Кастрычніцкім раёнамі («як многа гавораць мне назвы такія»). А можа ўвогуле нічога не расклейвалі, а проста гучна жартавалі на беларускія тэмы. Так бы мовіць, нецэнзурна лаяліся. Штатная сытуацыя нашых дзён. На наступны дзень самы гуманны на сьвеце судзьдзя Ш. праштампаваў прысуды: па сем сутак. Так выйшла, што я ведаю адну з затрыманых — бялявую Сьвятлану П., будучую мэдсястрычку, ведаю, хоць і завочна, яе немаладую, спрацаваную маму, брата, які вымушаны быў кінуць працу і правесьці два дні каля суду і ізалятара.

Працуючы ў адным з апошніх бастыёнаў беларускай свабоды і пераезьдзіўшы паўкраіны, ведаю сотні такіх сьветлых юнакоў, расклейшчыкаў і хуліганак. Хтосьці зь іх — Кастусь, Алесь ці тая самая Сьвятлана, выпускнікі акрэсьцінскага, а часам, на жаль, валадарскага, шклоўскага ўнівэрсытэтаў — гадоў праз 20—30 узначаляць нашу краіну. У гэтым я бачу вялікі шанец беларускай нацыі.

**Барыс Тумар**

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ




# Беларусь:

## ні Эўропа, ні Расея

Меркаваньні беларускіх эліт

**27 красавіка** (пятніца) у сядзібе БНФ «Адраджэньне» (вул.Варвашэні, 8) адбудзецца прэзэнтацыя кнігі варшаўскага выдавецтва «ARCHE» **«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт».** Створанае з удзелам 30 палітычных, грамадзкіх і культурных дзеячоў Беларусі (Вольга Абрамава, Вячаслаў Кебіч, Аляксандар Мілінкевіч, Сяргей Касьцян, Валеры Фралоў, Усевалад Янчэўскі ды інш.), выданьне адлюстроўвае погляды беларускай эліты на пытаньне месца Эўропы і Расеі ў нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў. **Пачатак а 17.00.** Уваход вольны.

# Барыс Ельцын



У сераду адбылося пахаваньне першага прэзыдэнта Расеі Барыса Ельцына (нарадзіўся ў 1931 г.) Ельцын займаў пасаду прэзыдэнта Расеі з 1991 па 31 сьнежня 1999 г., калі ён нечакана заявіў пра сваю адстаўку.

## Станіслаў Шушкевіч: «Ён ніколі ня лаяўся матам»

Першы кіраўнік незалежнай Беларусі **Станіслаў Шушкевіч** разьвітваецца з першым кіраўніком Расеі Барысам Ельцыным.

«Я смуткую з гэтай нагоды. Мае ўспаміны пра Барыса Ельцына самыя сьветлыя. Найперш гэта ўспаміны пра Віскулі. Ельцын быў першым сусьветным кіраўніком, які прызнаў незалежнасьць Беларусі. Мне заўсёды было прыемна кантактаваць з гэтым чалавекам. Праўда, з гадамі, як бы мне таго не хацелася, зносінаў паміж намі станавілася ўсё меней і меней. І Ельцын, і ягоная жонка былі надзіва прыстойнымі людзьмі, можа быць самымі прыстойнымі з тых, каго я сустракаў у жыцьці. У адрозьненьні ад большасьці кіраўнікоў дзяржаваў, Ельцын абсалютна ніколі не лаяўся матам.

Сумняюся, што ў Расеі нешта зьменіцца пасьля сьмерці Ельцына. Ягоны ўплыў апошніх гадоў быў вельмі маленькім. Мне здаецца, што Ельцын балюча ўспрымаў падзеі апошніх гадоў у Расеі. Хаця б тое ж вяртаньне савецкага гімну, Барыс Мікалаевіч лічыў, што савецкай спадчыне ня месца ў новай Расеі.

У адрозьненьне ад свайго наступніка Ельцын быў сапраўдным дэмакратам, можа часам аж занадта. Але нягледзячы ні на што ў яго атрымлівалася трымаць балянс паміж цэнтральнай уладай і ўладай на месцах».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

## Моцны поціск рукі

Эпізод зь Ельцыным згадвае **Віталь Тарас**.

У 1992 г. Барыс Ельцын прыехаў з кароткім візытам у Беларусь мацаваць сувязі з кіраўніцтвам яшчэ не саюзнай, а проста новай незалежнай дзяржавы. Ён выступіў у Вярхоўным Савеце. Гаварыў, зразумела, пра братэрскія сувязі расейскага і беларускага народу. І на завяршэньне прадэманстраваў падарункі. Гэта была вялізная фотавыява Белага дому ў Маскве (тады ў ім яшчэ быў расейскі парлямэнт, які разгоняць у кастрычніку 1993-га). А ў дадатак — фатакопія граматы цара Аляксея Міхайлавіча. Сярод часткі беларускіх журналістаў, якія назіралі за выступам з бальконаў Авальнай залі, прайшоў гул.

Журналісты тады адчувалі сябе ў парлямэнце вольна. Па завяршэньні афіцыйнага выступу журналісцкі натоўп падзяліўся — нехта кінуўся даганяць Ельцына са спадзевам на інтэрвію ці дадатковую інфармацыю. Нехта выйшаў на бакавую лесьвіцу папаліць і абмяняцца ўражаньнямі.

Мы з калегам Раманам Якаўлеўскім абмяркоўвалі двухсэнсоўнасьць падарункаў Ельцына. І ў гэты момант прадмет нашай размовы пачаў спускацца па лесьвіцы (відаць, яго выводзілі запасным ходам у мэтах бясьпекі). Раман Якаўлеўскі мае звычай гаварыць гучна. І тут ён адпусьціў нейкую іранічную рэпліку. Сэнс яе ўжо ня мае значэньня. Дый тая рэпліка была не адзіная.

Ельцын, які ўжо спусьціўся на марш уніз, раптам спыніўся, зрабіў разварот усім сваім мажным тулавам і рашуча разам з аховай пайшоў на журналістаў. «Мне здаецца, мяне не зразумелі», — прагрукатаў ён са сваёй непаўторнай інтанацыяй і пачаў паціскаць рукі ўсім запар, хто перад ім апынуліся. Ельцын патлумачыў журналістам мэты свайго візыту, чарговым разам засьведчыўшы павагу да незалежнай Беларусі.

Успомніў гэта не для таго, каб пахваліцца, што апынуўся побач з выдатнай асобай. Гонар паціснуць руку прэзыдэнту Ельцыну мелі сотні журналістаў і дзясяткі тысяч жыхароў розных краінаў.

А ўсё-ткі прыемна было тады адчуць моцны поціск ягонай рукі.

Бывай, Барыс Мікалаевіч!

## Ідэолягі адказалі «Нашай Ніве»

Адказ на нашаніўскі камэнтар «Дзьве зоркі» ідэальнай дыктатуры» быў дадзены апэратыўна, у апошнім выпуску тэлешоў на АНТ. Піша **Сяргей Будкін**.

На закіды датычна таго, што ў журы спрэс пэўныя асобы, стваральнікі праграмы адгукнуліся запрашэньнем ў раду экспэртаў акторкі Сьвятланы Зелянкоўскай і рэктаркі ўнівэрсытэту культуры Ядзьвігі Грыгаровіч. У адказ на тое, што ў перадачы няма ані каліва беларускасьці, прасьпявалі блёк беларускамоўных «гітоў».
Дзяржаўныя ідэолягі спрабуюць рэалізоўваць стратэгію падмены. Доказам таму быў і канцэрт «За незалежную Беларусь» на 25 Сакавіка, і «бээрэсэмаўская» акцыя «Чарнобыльскі шлях — дарога да будучыні», «трэшавая» рэклама якой ідзе цяпер па ТВ з пэрыядычнасьцю рэклямы «Супэрлято».
Адзін з арганізатараў першага жалобнага мерапрыемства «Чарнобыльскі шлях'1989» Генадзь Грушавы ў нашай размове колькі дзён таму толькі горка ўсьміхнуўся: «Яны хоць цямяць, які сэнс надаюць гэтым спалучэньням словаў?!»
У «Дзьвюх зорках» тая самая стратэгія падмены: калі па-беларуску, дык канечне нешта кшталту «Чаркі на пасашок».

# Сідорскі прызнаў праблемы ў эканоміцы

Прэм’ер-міністар Сяргей Сідорскі на паседжаньні Савету міністраў у аўторак у прыстунасьці журналістаў раскрытыкаваў стан нацыянальнай эканомікі. Прэм’ер назваў першы квартал 2007 г. «цалкам правальным» для Міністэрства прамысловасьці, «Белдзяржхарчпраму» і асабліва «Белнафтахіму», які за тры месяцы не дабраў з балянсу паліўна-энэргетычных рэсурсаў больш за 1 млн тонаў нафты.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Прэм’ер агучыў раней невядомыя лічбы: на складах у 4,4 раза павялічыліся запасы лядоўняў, на 200% — запасы пральных машынаў, фактычна страчаны рынак айчыннымі вытворцамі тэлевізараў.

Што тычыцца «Белдзяржхарчпраму», дык яго цяжкасьці не абмяжоўваюцца цукрам. Маргарынавай прадукцыі выраблена 77% ад пляну, мыла — 58%, кандытарскіх вырабаў — менш за 100%.

Адставаньне за студзень было 700 тыс. тон, за люты-сакавік дадалося яшчэ 300 тыс. тонаў.

**Мікола Бугай**

# Цэны на кватэры ў рэгіёнах пайшлі ў галоп

Моцная хваля падаражаньня жытла на другасным рынку сталіцы закранула таксама абласныя цэнтры, паведамляе «Звязда». Паводле інфармацыі газэты, на фоне істотнага скарачэньня агульнай прапановы і ажыятажнага попыту.

Сярэдняя цана аднапакаёвых кватэр у сталіцы дасягнула $67 820. Трохпакаёўкі ў сталіцы даражэюць на $30—35 у тыдзень за кв.м.

У Віцебску аднапакаёвыя кватэры таксама падаражэлі на $8—10 тыс. за тры месяцы. Кватэра агульнай плошчай 38 кв.м каштуе цяпер $32—33 тыс.

У Берасьці цана квадратнага мэтра невялікага па плошчы жыльля дасягнула $1000—1100. Звычайная цана трохпакаёвак тутака дасягнула $65—70 тыс.

Спэцыялісты мяркуюць, што кватэры будуць даражэць нават летам, бо істотна вырас кошт будаўніцтва новага жытла. Квадрат у навабудоўлях прадаецца цяпер за $1070.

Цэны на сацыяльнае жыльлё для чаргавікоў кантралююцца дзяржавай. Яны напалову ніжэйшыя за рынкавыя. Аднак гэта жытло ў дамах горшай якасьці, з выпадковым кантынгентам жыхароў, а самае галоўнае такія кватэры даступныя толькі малому колу людзей.

**МБ**

# Рост працягваецца

Адзіным трывожным паказчыкам застаецца сальда замежнага гандлёвага балянсу.

Міністар статыстыкі Ўладзімер Зіноўскі падвёў вынікі працы эканомікі за першы квартал 2007 г. У цэлым, як адзначыў міністар, эканоміка захавала станоўчыя паказчыкі. Практычна ва ўсіх сфэрах адбываецца рост. ВУП за квартал вырас на 8,4% у параўнаньні з такім самым тэрмінам летась. Большая лічба тлумачыцца цёплай зімой і палітыкай эканоміі энэргіі. У.Зіноўскі адзначыў: калі б не напружаньне ў пытаньні паставак паліва з Расеі, лічба магла б скласьці 10%.

Затое сальда замежнага гандлю знаходзіцца ў глыбокім мінусе, які павялічыўся ў параўнаньні з мінулым годам. Так, адмоўнае сальда замежнага гандлю сёньня складае 659 мільёнаў даляраў, а адмоўнае сальда ў гандлі з Расеяй яшчэ большае – 795 мільёнаў даляраў.

Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва павялічыліся на 13,5%, хоць заробкі — толькі на 9,8%. Розьніцу ў гэтых паказчыках забясьпечылі прадпрымальнікі, валютныя апэрацыі, продаж маёмасьці. Разрыў паміж даходамі 10% самых багатымі і 10% самых бедных вырас да 5,6 разоў.

Упершыню за апошні час пачала павялічвацца нараджальнасьці і падаць сьмяротнасьць. Насельніцтва Беларусі цяпер складае крыху больш за 9.700 тысяч жыхароў. Гэта на 600 тысяч меней, чым яно было ў 1994 г.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Рубель таньнее

Паводле Нацбанку, на 25.04. эўра каштуе 2909 руб., даляр — 2145 руб. Попыт на валюту на Міжбанкаўскай валютнай біржы стабільна перавышае прапанову. Эўра дасягнуў рэкордна высокай ад 2004 г. каціроўкі.

### Бізнэсоўцы заклікаюць ЭС захаваць гандлёвыя прэфэрэнцыі

Беларускія бізнэс-асацыяцыі звярнуліся да Эўрасаюзу з просьбай захаваць за Беларусьсю гандлёвыя льготы ў межах агульнай сыстэмы прэфэрэнцый ЭС. Пэтыцыю падпісалі Асацыяцыя прадпрыемстваў прамысловасьці, менскі саюз прадпрымальнікаў, Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў ды інш.

У звароце адзначаецца, што рашэньне, якое можа ўступіць у сілу ў чэрвені, выкліча скарачэньне экспарту і гандлю. Паводле інфармацыі «НН», зборам подпісаў пад праектам займалася вэртыкаль. Зьняцьцё льготаў выкліканае парушэньнем правоў прафсаюзаў у нашай краіне.

### Сяляне збываюць скаціну

У асабістых гаспадарках закупкі малака ў першым квартале зьменшыліся на 6%, а мяса — на 10%, сьведчыць Міністэрства статыстыкі і аналізу. Працэс закрануў усе вобласьці, апроч Магілёўскай. Гэта азначае, што старэючае насельніцтва вёскі масава адмаўляецца ад кароваў і кабанчыкаў.

**СП**

# Такая вось любоў...

Пасьля таго як «Наша Ніва» выйшла з загалоўкам на першай паласе «Клён Фінькевіча», адміністрацыя «хіміі» зьбіралася сьсекчы тое дрэва. Палітвязьня Артура Фінькевіча наведаў карэспандэнт «НН».

Камэндатура, дзе адбывае пакараньне Артур Фінькевіч, разьмяшчаецца на ўскрайку Магілёва. Першае ўражаньне — не турма, хутчэй казарма. І там паўтара году, і тут Фінькевічу трэба адбываць такі ж тэрмін. Пры ўваходзе асацыяцыі толькі павялічваюцца. Нейкі капітан на прахадной перапісвае нашы пашпартныя зьвесткі, пытаецца ня толькі месца прапіскі, але і пражываньня, як на КПП. Хіба што не запытваецца, кім мы даводзімся Фінькевічу. Пасьля загадвае нейкаму насельніку камэндатуры паклікаць Артура, той паслухмяна бяжыць, нібы салдат.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Праз пару хвілінаў зьяўляецца і Фінькевіч. Выглядае добра, ружовашчокі, усьміхаецца. Пытаецца на прахадной, ці можна выйсьці пасядзець на вуліцы, на сонцы. Кажуць, што не. Размаўляйце на калідоры. «Могуць выпусьціць, а могуць — не. Гэта ў залежнасьці ад таго, што за зьмена і які ў яе настрой».

Артур расказвае, што над ім вісяць тры папярэджаньні, вынесеныя па сьмешных абвінавачваньнях, — спазьніўся з працы на 13 хвілінаў... схадзіў пасьля адбою ў прыбіральню... Адміністрацыі выгадна трымаць Фінькевіча на грані. Будзе яшчэ адно — і хлопец накіруецца адбываць пакараньне ў калёнію. Пакараньне можа быць да трох гадоў, прычым час, які ён адбыў на «хіміі», ня будзе ўлічвацца. «Такая вось любоў...». Артур увесь час паўтарае гэтую фразу.

Кажа, што даўно нікога не было зь Менску, апошнім дзесьці месяц таму прыяжджаў кіраўнік дыпкорпусу АБСЭ Оке Пэтэрсан. Магілёўцы ў сваю чаргу прыходзяць спраўна. Расказвае, што досыць часта тэлефануюць маладзейшыя сябры, просяць парадаў. Артур для іх маральны аўтарытэт. Кажа, што паспрабаваць зарэгістраваць «МФ» у любым выпадку варта, а там паглядзім.


АРЦЁМ ЛЯВА
**Інтэрнат, у якім адбывае тэрмін Фінькевіч.**

Расказвае пра ліставаньне з Дашкевічам. Кажа, што менавіта Зьмітру цяпер найцяжэй. Дашкевіч быў у Артура за дзень да арышту. Назаўтра Фінькевіч сам датэлефанаваўся да сябра, які зь першых вуснаў паведаміў, што арыштаваны. Падчас наступнага званка слухаўку падняў ужо Галіеў, адвакат Зьмітра.

Наконт справы «Маладога фронту» Фінькевіч ня мае аптымістычнага прагнозу. «Пасадзяць, бо не для таго крымінальныя справы заводзілі, каб пасьля выпусьціць — кажа ён, а пасьля дадае: — Усё адно на іхныя месцы прыйдуць новыя людзі, яшчэ маладзейшыя».

Фатаграфаваць у фае камэндатуры нельга, ізноў міжволі ўзьнікаюць асацыяцыі з вайсковай часткай.

Калі спачатку Артур прасіў, каб яму прывозілі як мага болей кніжак, то цяпер імпэту крыху паменшыла. Кажа, што асабліва чытаць няма калі, ды асьцерагаецца захоўваць кніжкі ў пакоі, бо «хто ведае, могуць прышыць яшчэ і агітацыю сярод зьняволеных». Прачытае і перадае на захоўваньне сваім магілёўскім сябрам.

Артуравага часу хапае толькі на вучобу ў ЭГУ, яго прынялі на факультэт міжнародных адносінаў. Спрабуе ў час дасылаць ва ўнівэрсытэт кантрольныя работы. Штопраўда, не заўсёды ўдаецца. З працамі дапамагаюць, чым могуць, старшыня магілёўскай суполкі ТБМ Алег Дзячкоў, іншыя сябры і знаёмыя. Цяпер Фінькевіч на дыстанцыйным навучаньні, але па вызваленьні трэба будзе тэрмінова здаць ангельскую, нямецкую і літоўскую мовы.

Артур Фінькевіч цяпер працуе прыбіральшчыкам у дзіцячым садку. Гэта другая ягоная праца падчас «хіміі». Спачатку ён клаў плітку на магілёўскіх вуліцах. У садку Артуру працаваць падабаецца, заробак 250 тысяч. Была яшчэ магчымасьць працаваць пастухом у вёсцы, але там ад Фінькевіча патрабавалі расьпіску, што ў выпадку чаго ён будзе адказваць матэрыяльна. Хлопец адмовіўся даваць такую расьпіску.

Адразу пасьля таго як «Наша Ніва» выйшла з загалоўкам на першай паласе «Клён Фінькевіча», адміністрацыя зьбіралася сьсекчы тое дрэва, пра што Артуру і паведамілі. Аднак урэшце здаровы сэнс пераміог і клён ля альтанкі працягвае набіраць моц.

Артур расказвае, што не заўсёды мае магчымасьць памыцца, бо душ працуе па раскладзе. Недзе тры разы на тыдзень па некалькі гадзінаў. Ясная справа, што ня ўсе пасьпяваюць прыняць водныя працэдуры. У пакоі Артура цяпер жыве шасьцёра чалавек. Часта напіваюцца, на іх парушэньні адміністрацыя заплюшчвае вочы. Са словаў Фінькевіча, палова суседзяў гатовая дакладваць адміністрацыі пра любую правіннасьць і любое слова, дзеля птушачкі ў асабістую справу, каб лішні раз зьезьдзіць дадому ці атрымаць пару гадзінаў выйсьця ў горад у выходны дзень. У самога ж Артура візытаў дадому не прадбачыцца, як не прадбачыцца для яго і амністыі. Бо злосны парушальнік. Тэрмін зьняволеньня скончыцца ў сьнежні. Засталося яшчэ больш чым паўгоду. Такая вось любоў...

**Зьміцер Панкавец**

### Беларусь пагадзілася на прадстаўніцтва Эўракамісіі

МЗС Беларусі дало згоду на адкрыцьцё прадстаўніцтва Эўракамісіі ў Менску. Адказу на свой запыт Брусэль чакаў больш за два гады. Наступным крокам стане абмеркаваньне пагадненьня між Менскам і Брусэлем аб умовах і мэханізьме адкрыцьця офісу.

Прэс-сакратарка эўракамісара па замежных сувязях адмовілася гаварыць пра матывы, якія падштурхнулі беларускія ўлады да такога рашэньня менавіта цяпер.

**Алесь Кудрыцкі, Брусэль**

### Незалежнае ТВ — з кастрычніка

Грамадзкае Польскае тэлебачаньне й МЗС Польшчы падпісалі пагадненьне пра стварэньне тэлеканалу ТВ Беларусь. Згодна з кантрактам, ТВ фінансуецца з рэзэрвавага бюджэту МЗС.

Гэта будзе спадарожнікавы канал. Плянуецца, што праграма будзе трансьлявацца па двух спадарожніках 15 гадзін у суткі. Старт каналу заплянаваны на кастрычнік.

Выдаткі на дзейнасьць ТВ сёлета складуць 16 млн. злотых (4 млн эўра).

**Польскае радыё для замежжа**

### Бяляцкі стаў віцэ-прэзыдэнтам

Старшыня незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі абраны віцэ-прэзыдэнтам усясьветнай праваабарончай арганізацыі FIDH (The International Federation for Human Rights).

Адбылося гэта падчас кангрэсу FIDH у партугальскім Лісабоне.

Летась сп.Бяляцкі быў кандыдатам на Нобэлеўскую прэмію міру. У 2006-м узнагароджаны прэміяй імя Сахарава ў Нарвэгіі, а ў Чэхіі з рук Вацлава Гаўла атрымаў прэстыжную прэмію «Homo homini» («Чалавек чалавеку»).

**Зьміцер Панкавец**

# Вырашэньне

Зварот **Аляксандра Лукашэнкі** да нацыянальнага сходу быў вытрыманы ў напружаным тоне і насычаны патрабаваньнямі адміністрацыйнага ўмяшаньня ў эканоміку. Сярод іншага, у жывым эфіры было запатрабавана пасадзіць былога міністра будаўніцтва Курачкіна і «тых, хто яго прыкрывае».

Традыцыйнае веснавое пасланьне народу і парлямэнту сёлета прыпала на 24 красавіка і было прызначана на 12.00. Аляксандар Лукашэнка зьявіўся са спазьненьнем на сем хвілінаў. Паседжаньне адкрыў Уладзімер Канаплёў. Прагучаў гімн «Мы, беларусы, мірныя людзі…»

«Паважаныя таварышы, — сказаў А.Лукашэнка. — Перш чым пачаць зварот, не магу ня выказаць словы спачуваньня Барысу Ельцыну…» Ён заклікаў ушанаваць памяць Ельцына хвілінай маўчаньня.

### «Альтэрнатывы адносінам з Расеяй няма»

«Незалежная Беларусь — наш надзейны і дастойны дом», — такі загаловак сёлетняга пасланьня.

А.Лукашэнка пачаў з падкрэсьліваньня, што незалеж-

# Вайна з «талеркамі»

«Усталёўваць спадарожнікавыя антэны — забаронена!» Гэтай навіной узрушаныя жыхары Ліды. Вынік лідзкага канфлікту вырашыць лёс спадарожнікавай тэлевізіі у Беларусі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Аб’явы з пагрозай «да вінаватых будуць прымененыя меры адміністрацыйнага ўзьдзеяньня» па горадзе разьляпілі ўсе 13 ЖЭС.

«Ніхто ня хоча здымаць! — скардзіцца старэйшы майстар ЖЭС №3 Тэрэза Лазоўская. — Кажуць: "Толькі праз суд!"

28 сакавіка ЖЭСы Ліды атрымалі ад гарадзкога УЖРЭП Загад: «Склясьці сьпісы… самавольна ўсталяваных спадарожнікавых антэнаў… Пры выдачы загаду пра зьняцьцё ўсталяваць тэрмін устараненьня парушэньняў 10 дзён».

А УЖРЭП выконвае загад Гарадзенскага аблупраўленьня ЖКГ ад 20 сакавіка. У дакумэнце да спадарожнікавых антэнаў можна аднесьці: «Пры правядзеньні агляду жыльлёвага фонду асаблівую ўвагу зьвярнуць на тэхнічны стан… індывідуальных антэнаў…»

На пытаньне, як «зьвярнуць увагу» пераўтварылася ў «да вінаватых будуць прымененыя меры», намесьнік дырэктара Лідзкага ЎЖРЭП Віктар Вайтулевіч адкрывае шуфляду і дастае пажоўклую кніжку «Правілы і нормы ўтрыманьня жылых дамоў» 1990 г. «Чытайце: «Забаронена… усталёўваць на дахах і фасадах індывідуальныя антэны…»

Працэдура атрыманьня дазволу на ўсталяваньне антэнаў у заканадаўстве не прапісаная. В.Вайтулевіч мяркуе, трэба рабіць, як у выпадку пераплянiроўкі жытла: зрабіць праект, зацьвердзіць у пажарных, санстанцыі, архітэктараў, падпісаць дамову з бударганізацыяй, аддаць дакументы ва УЖРЭП, той перадасьць у выканкам, а там вырашаць… I тут чыноўнік адкрывае «Правілы карыстаньня...»: «Забаронена… »

ЖЭС №3 на сваёй тэрыторыі “выявіў” 150 антэнаў. Усяго «талерак» у горадзе каля 2 тысячаў. Чаму праз 17 гадоў раптам вырашылі выканаць старыя законы? В.Вайтулевіч прыводзіць розныя аргумэнты: «Хто ведае, як яны замацавалі антэну?! А раптам людзям на галаву ўпадзе? Ды невядома, як яна на здароўе ўплывае… А калі кожны «талерку» паставіць — уяўляеце, што атрымаецца з дома?! Дый: ёсьць кабэльная тэлевізія — хочаш 7 каналаў, сацыяльны пакет бясплатна, хочаш — 12, хочаш — 30! Што на «талерцы»глядзець?! Мне і двух каналаў хапае!»

Сяргей Коваль, якому ЖЭС загадаў зьняць «талерку», пэўны: «наступ на антэны» зьвязаны з хуткім стартам незалежнага каналу «Белсат»: «Улады вырашылі ў Лідзе, паглядзець, як народ рэагуе на забарону. Калі паздымаем антэны — пачнецца па ўсёй краіне».

**Ірына Чарняўка**

# непасільных задачаў

насьць краіны можа быць забясьпечана толькі «больш сымэтрычнай» замежнай палітыкай. Але пасьля паўтарыў, што ніякіх зьменаў у ёй ня будзе і што Расея і саюз зь ёю застаюцца ў прыярытэтах: «Расейскія людзі нам не чужыя. Альтэрнатывы адносінам з Расеяй няма».

Ад адносінаў з Расеяй ён перайшоў да адносінаў з Украінай і Азэрбайджанам і заявіў пра неабходнасьць забесьпячэньня бесьперабойнасьці паставак энэрганосьбітаў у Заходнюю Эўропу.

## «Вось і ўся Вэнэсуэла»

Пасьля А.Лукашэнка засяродзіўся на энэргетыцы. Ён рэзка раскрытыкаваў нафтаперапрацоўчую галіну, заклікаўшы нафтавікоў шукаць сродкі не ў бюджэце, а ў саміх сябе. Ён назваў стварэньне ўласнабеларускай калійнай кампаніі справай, якая прынесла надзвычайную карысьць краіне, і запатрабаваў хутчэй стварыць аналягічную нафтавую кампанію.

Ён адзначыў важнасьць забесьпячэньня рэзэрвавых варыянтаў паставак нафты з Балтыйскага і Чарнаморскага рэгіёнаў. Краіна пачула прызнаньне, што ў часе беларуска-расейскага нафта-газавага крызісу альтэрнатывы пастаўкам нафты з Расеі першыя 10 дзён не было.

А.Лукашэнка падкрэсьліў: калі Расея прапануе больш выгадныя варыянты паставак энэрганосьбітаў, Беларусь застанецца з Расеяй.

Пасьля гэтага кіраўнік дзяржавы перайшоў да важнасьці выкарыстаньня альтэрнатыўных крыніцаў энэргіі. Меўся на ўвазе перавод на дровы малых прадпрыемстваў і вёсак.

Ён заклікаў апазыцыю «не іграць» на пытаньні пабудовы атамнай электрастанцыі, бо АЭС — зарука нацыянальнай і энэргетычнай бясьпекі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ён заявіў, што ня хоча, каб АЭС будавала Расея, але пабяцаў адкрыты міжнародны конкурс. «Мы й так у многім залежым ад Расеі. Мы б хацелі, каб АЭС пабудавалі іншыя, але прыярытэт будзе аддадзены цане і якасьці. Калі конкурс выйграе Расея, як бы нам ні хацелася, каб яйка зноў не трапляла ў адзін кошык, будзе будаваць Расея».

Ён падрабязна спыніўся на пытаньнях энэргаашчаджэньня. «У нас энэргаёмістасьць ВУП у 2,5 разы вышэйшая, чым у разьвітых краінах. Вось і ўся Вэнэсуэла», — заявіў ён.

Вывад просты: лічыльнікі вады мусяць быць усталяваныя ў кожнай кватэры.

«Павышэньне цэнаў на энэрганосьбіты — непрыемны фактар, але давайце разглядаць яго як стымул для ўдасканаленьня эканомікі», — прапанаваў А.Лукашэнка.

## «Каровы дызпаліва не даюць»

Трэцяй часткай пасланьня стала эканоміка. Асновай дзяржаўнага курсу тут стане зьмяншэньне дзярждатацый. Па яго словах, з 2008 г. субсыдыі пойдуць толькі ў найноўшыя, навукаёмістыя тэхналёгіі.

«Каровы дызэльнага паліва не даюць», — заявіў ён. Таму льготнага дызпаліва сельгаспрадпрыемствы не атрымаюць.

Ён назваў апраўданым курс на паступовую перадачу прыватнаму ўласьніку сельгаспрадпрыемстваў.

Ён нагадаў, што канчатковае рашэньне па прыватызацыі кожнага прадпрыемства будзе прымаць асабіста ён. «Мне за 13 гадоў ніхто не прынёс ніякіх грошай і не паклаў на стол, не прынясе і не пакладзе. Калі б такое было, ужо б расьпісалі, размазалі па ўсіх сьценках ад Захаду да Ўсходу. Калі ўжо Буш там шукаў мае рахункі, дагэтуль знайсьці ня можа. Ну, калі Буш не знайшоў, то наўрад ці хтосьці знойдзе, калі яны нават былі».

Ён гаварыў пра першачарговыя задачы мадэрнізацыі энэргетычнага комплексу, мікраэлектроннай, лясной і цэлюлёзна-папяровай прамысловасьці, будаўніцтва.

Было заяўлена пра неабходнасьць рэзка скараціць ільготы ў сацыяльнай сфэры.

## «Разьбярыцеся і пасадзіце»

Ня раз за выступ ён вяртаўся да сфэры будаўніцтва і росту цэнаў на жытло. Ён рэзка крытыкаваў Міністэрства будаўніцтва і яго праектныя інстытуты.

Са словаў А.Лукашэнкі, міністар Навумаў у часе суботніка заявіў, што былога міністра будаўніцтва трэба неадкладна пасадзіць. «Дык у вас жа ёсьць для гэтага паўнамоцтвы», — зьвярнуўся ён да міністра, які ўскочыў зь месца. За тое, што ён нарабіў на пасадзе міністра і на пасадзе дырэктара інстытуту, на якую ён перайшоў зь міністэрства і дзе пачаў ужо «калупаць пад мільёны даляраў, вылучаных на пабудову спартовага комплексу». «Ну дык разьбярыцеся і пасадзіце і яго, і тых, хто яго прыкрывае», — заявіў А.Лукашэнка, дадаўшы, што міністар унутраных справаў унёс прэм'ер-міністру прапанову і напісаў за што. Гэта нагадала знаёмыя сцэны з 90-х гадоў.

У цэлым тон выступу быў далёка ня рынкавым. Фактычна ў кожнай сфэры ён патрабаваў адміністрацыйных мераў рэгуляваньня рынку і падкрэсьліваў асабісты кантроль за рознымі сфэрамі эканомікі. Часам супярэчыў сам сабе. Гаварыў пра «ўсямерную падтрымку прыватнага прадпрымальніцтва», «стабільнасьць умоваў гаспадараньня» і адначасова загадваў прыняць адміністрацыйныя меры па абмежаваньні свабоды дзейнасьці ў тым самым будаўнічым бізнэсе і асабістым кантролі супрацоўнікаў вэртыкалі і КДК за тымі ці іншымі справамі: «Ня трэба шчоўкаць абцасамі, дрыжаць перад малымі прадпрымальнікамі і баяцца, што яны выйдуць на Плошчу».

«Гэта непасільныя, але вырашальныя задачы», — падкрэсьліў ён у іншым месцы.

Рэгулятывісцкі тон праяўляўся і ў гаворцы пра сацыяльную сфэру. Самымі часта ўжыванымі словамі ў дакладзе былі «павінен, павінны, абавязаны, трэба».

«Не магу сказаць, што мы ўсе праблемы вырашылі, — заявіў Лукашэнка пры канцы, — але кожны чалавек у Беларусі, які хоча добра жыць, можа лёгка гэтага дабіцца».

Часам ён жартаваў, але ў цэлым выглядаў даволі напружаным.

Зварот доўжылася меней за дзьве гадзіны і ні разу не перарывалася воплескамі.

**Мікола Бугай**

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Напаўраспад



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

Ад Чарнобылю да Малога Сітна больш як паўтысячы кілямэтраў. Дазымэтар паказвае тут норму, лейкемія ды рак шчытападобнай залозы рэгіструюцца ў раённым шпіталі зрэдку, і тутэйшыя жыхары ўжо адвыклі сьпісваць усе беды на калісьці папулярную «радыяцыю». Але адчуваньне *адчужанасьці* штогод тут толькі мацнее, не раўнуючы як у Хойніках ці Краснапольлі. Зямля занядбаная й засьмечаная, скрозь хаты з закалочанымі дошкамі вокнамі, люд наколькі малалікі, настолькі й смурны — такое ўражаньне, што нейкая нябачная, сьмяротная сіла горшыць край з самых зачумленых гушчараў. Павальнае п’янства, паўсюднае паленьне, звыклы мат пры дзецях і ня менш звыклая распута бяз сораму, усеагульная млявасьць і ашаламляльная абыякавасьць да жыцьця: відавочны пэрыяд *напаўраспаду*.

А дваццаць гадоў таму менавіта Чарнобыль стаў ударам звону, які скалануў і агромністую савецкую імпэрыю, і Беларусь, заклікаючы ня проста да перабудовы, а да ўсенароднага пакаяньня. Пасьля Чарнобылю, што пранікае да атамаў і генаў, уявіць сабе рэальнасьць грэху, пекла й д’ябла нацыі аказалася значна лягчэй. Вось чаму Чарнобыльскі шлях ужо пры канцы 1980-х зрабіўся галоўнай нашай маніфэстацыяй.

Пасьля Чарнобылю беларусы сапраўды жахнуліся бязьвіднае, усюдыснае сьмерці — і адчайна рвануліся да жыцьця. Пэрыяд ядравага распаду СССР аказаўся самым плённым у найноўшай гісторыі Беларусі, бо даў штуршок нацыянальнаму адраджэньню, дзяржаўнай незалежнасьці й хрысьціянскаму рэнэсансу.

Але вось сёньня, калі чарнобыльскі страх у масавай сьвядомасьці расьсеяўся, раптам выявілася, што ёсьць рэчы страшнейшыя за чацьвёрты энэргаблёк. У Беларусі няўхільна сьпіваецца больш за мільён чалавек. Паводле апошняга перапісу, 60% беларусаў не карыстаюцца беларускай мовай. У адным толькі Менску штогод робіцца па 50 тысячаў абортаў. І пры гэтым большасьць жыхароў Беларусі, згодна з апошнімі сацыялягічнымі апытаньнямі,

## ХРОНІКА

### 20 красавіка

#### Самім брыдка стала

Крымінальная справа ў дачыненьні да **Анджэя Лісоўскага** закрытая. Нагадаем, 29 кастрычніка 2006 г. у яго аўтамабілі, якім зь Вільні вярталася не прызнаная ўладамі лідэрка Саюзу палякаў **Анжаліка Борыс**, мытнікі знайшлі невядомы парашок. Начальнік Гарадзенскай рэгіянальнай мытні **Юры Сянько** заявіў, што гэта амфэтамін. Падазраваным у кантрабандзе наркотыкаў быў прызнаны А.Лісоўскі. Цяпер сьледчы КДБ **Алег Грыневіч** паведаміў, што Лісоўскі можа забраць машыну, якая знаходзілася на стаянцы УКДБ. Таксама ён паведаміў, што крымінальная справа супраць Лісоўскага спыненая, але па факце кантрабанды наркотыкаў сьледзтва ідзе. Лісоўскі кажа, што ў аўто замест новага акумулятара апынуўся чужы і стары.

#### Справа шасьці

Баранавіцкі актывіст незарэгістраванага «Маладога фронту» **Яраслаў Грышчэня** стаў сёмым сябрам «МФ», супраць якога пачалі крымінальную справу за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Справы супраць **Насты Палажанкі**, **Аляксея Янушэўскага**, **Барыса Гарэцкага** й **Зьмітра Хведарука** знаходзяцца ў судзе Савецкага раёну Менску. Заведзеная справа й на **Алега Корбана**. Лідэр «МФ» **Зьміцер Дашкевіч** адбывае пакараньне ў Шклоўскай калёніі.

#### Суд пакінуў безь зьмяненьняў

Магілёўскі абласны суд адхіліў апэляцыю моладзевага актывіста **Антона Ўсьцімчука**. 2 красавіка Ленінскі райсуд даў яму 7 сутак арышту паводле арт.17-1 КаАП (дробнае хуліганства). Маладзён быў затрыманы напярэдадні Дня Волі. Працэс вяла судзьдзя **Лілія Гурыновіч**.

#### Леванеўскаму вярнулі рэчы

Лідэру прадпрымальнікаў **Валер’ю Леванеўскаму** вярнулі канфіскаваныя рэчы. 12 сакавіка аўтамабіль Леванеўскага быў затрыманы супрацоўнікамі ДАІ па дарозе ў Менск на мітынг прадпрымальнікаў. Фотаапарат, дыктафон, мэгафон, аўтаномны генэратар і іншыя рэчы Леванеўскага і Васільева, якія знаходзіліся ў машыне, канфіскавалі без тлумачэньняў і належнага афармленьня. Так і не вярнулі копіі звароту сп.Леванеўскага ў Адміністрацыю прэзыдэнта і Савет міністраў, якія палічылі за ўлёткі.

#### У абарону «Маладога фронту»

На цэнтральных вуліцах Менску, у пераходах, каля станцыяў мэтро й грамадзкага транспарту зьявіліся ўлёткі з заклікам спыніць рэпрэсіі супраць актывістаў **«МФ»** і партрэты маладафронтаўцаў, якіх судзяць.

#### Флэш-моб у падтрымку Клімава

У Менску прайшоў флэш-моб у падтрымку **Андрэя Клімава**. Дзесяць маладых людзей сабраліся на плошчы Якуба Коласа і прайшлі да гандлёвага цэнтру «Імпульс» з партрэтамі арыштаванага палітыка, раздалі мінакам улёткі зь біяграфіяй Клімава. Ніхто ня быў затрыманы.

#### Моладзь бунтуецца

Актывісты моладзевага руху **«Бунт»** зьбіралі ў цэнтры Менску подпісы і раздавалі ўлёткі супраць законапраекту пра скасаваньне льготаў. У іх гаварылася, што ўрад зьбіраецца скасаваць ільготны праезд у грамадзкім транспарце для студэнтаў і школьнікаў, а таксама для дзяцей-інвалідаў.

#### Абшукалі рэчы й выселілі

Адміністрацыя палічыла яго вінаватым у расклейцы ў будынку налепак «Чарнобыльскага шляху», бо налепкі былі знойдзеныя ў асабістых рэчах актывіста. Дагляд рэчаў рабіў начны камендант Дваракоў з дазволу Яўгена.

### 22 красавіка

#### Пэрформанс з «Запарожцам»

На адно з цэнтральных скрыжаваньняў **Барысава** быў вывезены стары, пабіты аўтамабіль «Запарожац». На бакох у яго было напісана «Дыктатура дастала!».

### 23 красавіка

#### Менгарвыканкам папярэджвае

Заяўнікі акцыі з нагоды Дня Волі, якая прайшла ў Менску 25 сакавіка, атрымалі пісьмовыя папярэджаньні Менгарвыканкаму. Яны адрасаваныя лідэру аб’яднаных дэмсілаў **Аляксандру Мілінкевічу**, лідэру Партыі БНФ **Вінцуку Вячорку**, выканаўцу

лічыць: краіна разьвіваецца ў слушным кірунку.

Радыяцыйныя хмары накрылі 1/5 тэрыторыі Беларусі й сталі прычынаю сьмерці тысячаў. Духовы Чарнобыль ахапіў усю краіну й павольна, але мэтанакіравана нішчыць мільёны.

І што характэрна: сёньняшняя ўлада, паводле вызначэньня пакліканая ліквідаваць наступствы любое, ці то прыроднае, ці то тэхналягічнае, ці то маральнае катастрофы, — робіць роўна супрацьлеглае. І заклік зноў засяляць заражаныя чарнобыльскія вёскі, і палітыка ў галіне *ідэалёгіі* і выяўляюць дзіўную, але несумненную пасьлядоўнасьць.

Хлусьня, відавочная й самазабыўная, на экранах штодня; суцэльны страх, што робіцца нармалёвым тонусам грамадзтва; гістэрычная нянавісьць да «ворагаў» і «Захаду» — усё гэта запускае ядравую рэакцыю маральнага распаду для ўсяе нацыі. Чарнобыль зь ягонай злачыннай безадказнасьцю й замоўчваньнем вынікаў выбухнуў у задушлівай атмасфэры застою. Сёньняшняя беларуская *стабільнасьць* настолькі ж выбухованебясьпечная.

Галоўная афіцыйная газэта краіны друкуе то бязбожны маніфэст, то опус пра сямейныя здрады, якія, маўляў, ратуюць шлюб; хрысьціянаў штрафуюць за супольную малітву, а інтэлігентаў — за мат і спраўленьне патрэбы ў публічным месцы; урэшце, праслаўляюцца такія вылюдкі, як Ленін, Сталін і Гітлер, — і робіцца зразумела, што Чарнобыль чалавечае душы клакоча ўжо пад нагамі.

Можна растлумачыць адсутнасьць веры, волі, любові, нацыянальнай ды праўнай сьвядомасьці й іншую маральную анкалёгію ў целе рэжыму — усё гэта натуральныя прадукты савецкага тленьня.

Але як растлумачыць тое, што й мы адктыўна ўдзельнічаем у працэсе напаўраспаду Беларусі?

Любая доза хлусьні, пыхі, абыякавасьці, страху ў асяродзьдзі апазыцыі ўдвая больш небясьпечная. Мы самі носім у сабе чарнобыльскі рэактар грэху, які можа прывесьці да распаду краіны, — і мусім адказваць за наступствы.

Кожны, хто супрацьстаіць разбэшчанасьці, гвалту, беззаконьню, крыміналізацыі, спойваньню беларускага народу, — ліквідатар дыктатуры.

Бо ад духовага Чарнобылю, страшнейшага за радыяцыйны, Беларусь у стане выратавацца толькі праз нацыянальнае абуджэньне.

*Малое Сітна*

Пэрыяд ядравага распаду СССР даў штуршок нацыянальнаму адраджэньню, дзяржаўнай незалежнасьці й хрысьціянскаму рэнэсансу.

## ХРОНІКА

абавязкаў кіраўніка Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) **Анатолю Ляўковічу** і намесьніку старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) **Ігару Шынкарыку**. У лісьце за подпісам намесьніка старшыні Менгарвыканкаму **Міхаіла Ціцянкова** адзначаецца, што ў гарвыканкам паступілі «шматлікія звароты менчукоў і гасьцей сталіцы», у якіх выказаны «пратэст супраць правядзеньня несанкцыянаваных Менгарвыканкамам шэсьцяў і мітынгу, якія адбыліся 25 сакавіка».

### У Курапатах — новы вандалізм

Невядомыя зламысьнікі зламалі шэсьць крыжоў і некалькі пашкодзілі. Акт вандалізму засьведчылі ўдзельнікі талакі, якую ладзіць штосуботу Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ. Такое ў Курапатах чыніцца ўвесь час. Толькі «Лаву Клінтана», ад часу яе ўсталяваньня ў 1994 г., ламалі адзінаццаць разоў. Аднак міліцыя дагэтуль ня выявіла ніводнага злачынцы.

### Прабілі колы аўтамабіля Кулей

Невядомыя прабілі колы і напісалі «Дзякуй за адукацыю» на машыне кіраўніцы Камітэту дапамогі рэпрэсаваным «Салідарнасьць» **Іны Кулей**. Жонка А.Мілінкевіча лічыць, што гэта правакацыя тых, хто баіцца праграмы Кастуся Каліноўскага. Аналягічныя мэтады псыхалягічнага ўзьдзеяньня ўжываліся ў савецкі час, напрыклад, супраць Васіля Быкава і дысыдэнтаў.

### Улады ня любяць

Гарадзенскі гарвыканкам адмовіў у рэгістрацыі гарадзкой пярвічнай арганізацыі прафсаюзу працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП). Паводле адмовы, прафсаюз спазьніўся з падачай дакумэнтаў.

### Заяўнікі «Шляху» судзяцца

Заяўнікі «Чарнобыльскага шляху» **Аляксей Янукевіч**, **Анатоль Сідарэвіч**, **Юры Зянковіч** і **Валянціна Палевікова** падалі ў суд Маскоўскага раёну Менску скаргу на рашэньне Менгарвыканкаму. Арганізатары прасілі дазволіць «Чарнобыльскі Шлях» 26 красавіка а 18.00 на плошчы Якуба Коласа. Менгарвыканкам дазволіў ісьці ад Акадэміі навук да плошчы Бангалор. Заяўнікі лічаць, што гэтым Менгарвыканкам парушыў арт.6 Закону аб правядзеньні масавых акцый, бо рашэньне прымалася без узгадненьня з заяўнікамі. Арганізатары маюць намер прыйсьці 26 красавіка а 18.00 на плошчу Якуба Коласа.

### Сівакова апраўдалі

Менгарсуд не задаволіў касацыйную скаргу **Валянціны Сьвяцкай**. Жанчына прасіла скасаваць рашэньне суду Фрунзэнскага раёну Менску, які пастанавіў не прыцягваць да адказнасьці былога міністра ўнутраных спраў **Юр'я Сівакова**. Заяўніца таксама дамагаецца маральнай і матэрыяльнай кампэнсацыі ад Беларускай асацыяцыі вэтэранаў спэцпадразьдзяленьняў МУС «Гонар». Падставай для звароту ў суд стала публікацыя Юр'я Сівакова ў часопісе асацыяцыі «Журнал специального назначения», у якой аўтар цытаваў Гітлера.

### Улады шугаюцца

У часе паездкі **Аляксандра Мілінкевіча** па забруджаных раёнах у некаторых дзіцячых інтэрнатах у яго адмовіліся браць падарункі. Нібы туды тэлефанавалі прадстаўнікі ўладаў і загадвалі нічога ня браць.

### Цкаваньне дзяцей Казуліна і Лябедзькі

У БДУ пачалі ходзяць чуткі пра магчымае закрыцьцё факультэту міжнародных дачыненьняў. І зьвязана гэта не зь неабходнасьцю рэарганізацыі навучальнага працэсу ці павышэньня эфэктыўнасьці кіраваньня, а з прозьвішчамі двух студэнтаў — **Юлі Казулінай** і **Арцёма Лябедзькі**. Студэнтаў факультэту пераконваюць, што праз гэтых двух «таварышаў» узьнікаюць праблемы ва ўсяго факультэту.

### Затрымліваюць перад Шляхам

У панядзелак, а 20-й у Менску на месьце, што злучае вуліцу Маскоўскую і праспэкт Незалежнасьці, былі затрыманыя **Сьвятлана Панкавец, Юры Жыгалка, Эдуард Захараў і Аляксандар Стасюк.** Яны распаўсюджвалі налепкі, што заклікалі людзей прыйсьці на «Чарнобыльскі шлях» 26 красавіка. Усе яны правялі ноч у РУУС Маскоўскага раёну. 24 красавіка судзьдзя Савецкага райсуду ўсіх засудзіў на 5–7 сутак арышту.

# Цяжкасьці эвалюцыі

Што канкрэтна мае азначаць «новы курс» апазыцыі? Піша Віталь Тарас.

## Маша Шрайбер vs Чарлз Дарвін

Два месяцы таму вучаніца 5-й клясы сярэдняй школы ў Санкт-Пецярбургу Марыя Шрайбер адмовілася хадзіць на ўрокі біялёгіі з-за таго, што на іх выкладаецца тэорыя паходжаньня відаў.Тэорыя Дарвіна абражала рэлігійныя пачуцьці школьніцы. Ейныя бацькі падалі ў суд на органы адукацыі з мэтай, каб у школах нароўні зь біялёгіяй выкладалася біблійная тэорыя паходжаньня сьвету — так бы мовіць, на альтэрнатыўнай аснове. Суд быў прайграны. Маша Шрайбер разам з бацькамі зьехала з Расеі на эміграцыю — кажуць, кудысьці на Антыльскія выспы. Калі ў бацькоў ёсьць грошы, можна задаволіць любы дзявочы капрыз.

Аднак, многія дарослыя салідныя мужы падзяляюць погляды Машы. Асабліва калі гэтыя мужы належаць да царквы. Расейская праваслаўная царква на чале з патрыярхам Алексіем II выступіла за абавязковае выкладаньне ў агульнаадукацыйных школах Сьвятога Пісьма. Як заявіў патрыярх, «ніякай шкоды ня будзе школьніку, калі ён будзе ведаць біблійнае вучэньне аб паходжаньні сьвету. А калі нехта хоча лічыць, што ён пайшоў ад малпы — няхай так і лічыць, але не навязвае гэта іншым».

Алексій II амаль літаральна паўтарыў словы мітрапаліта Ўвядзенскага ў яго публічным дыспуце з наркампросам Луначарскім, які адбыўся больш за восемдзесят гадоў таму. Мітрапаліт тады сказаў, што калі ягонаму апанэнту падабаецца паходзіць ад малпы, дык хай так і будзе. А ён, мітрапаліт, лічыць сябе боскім стварэньнем. Пасьлядоўнікі наркампроса ды іншых бальшавіцкіх кіраўнікоў у далейшым «дыспуце» з царквой карысталіся зусім іншымі аргумэнтамі. На рэкамэндацыю Леніна яны расстралялі ці загналі ў канцлягеры большасьць сьвятароў, разбурылі і разрабавалі цэрквы.

Сучасныя камуністы — нашчадкі марксавай тэорыі рэвалюцыі як «лякаматываў гісторыі» — разам з праваслаўнымі атэістамі ходзяць у царкву па вялікіх рэлігійных сьвятах і хрыстосуюцца там са сьвятарамі. Гэта сьведчыць аб тым, што за апошнія восемдзесят гадоў у прыхільнікаў гістарычнага матэрыялізму адбылася пэўная эвалюцыя поглядаў. І што гісторыя, згодна з законамі дыялектыкі, рухаецца па сьпіралі.

Законы гэтыя, як вядома, маюць унівэрсальны характар. Прыкладна ў той самы час, калі ў Маскве адбываўся згаданы вышэй дыспут, у ЗША, у штаце Тэнэсі, адбываўся «малпавы працэс». Прыняты перад тым закон штата забараняў выкладаць «любую тэорыю, якая адпрэчвае гісторыю Боскага Стварэньня чалавека, якой нас вучыць Біблія, і вучыць замест гэтага аб тым, што чалавек пайшоў ад жывёлаў ніжэйшага парадку».

Школьнага настаўніка Скопса зь мястэчка Дэйтан, які абмяркоўваў з вучнямі тэорыю эвалюцыі Дарвіна, судзіў суд прысяжных. Яго абараняў вядомы адвакат Дароў, які давёў, што біблійную гісторыю аб стварэньні сьвету, як, напрыклад, і гісторыю пра Ёну, якога праглынуў кіт, нельга разумець літаральна. Фармальна суд прызнаў настаўніка вінаватым у парушэньні закону і прысудзіў яму штраф у 100 даляраў. Але была пададзеная апэляцыя, у выніку справа скончылася нічым. Ідэйная перамога засталася за адвакатам. А Дэйтан, дзе адбываўся суд, праславіўся на ўсю Амэрыку. Ёсьць вэрсія, што ўся справа была задуманая тамтэйшымі ўладамі, каб прыцягнуць увагу да мястэчка і надаць імпульс ягонаму  разьвіцьцю.

## Ці можа прэм’ер быць агностыкам?

Сёньня ў Амэрыцы, як і ў Расеі, зноў на самым высокім узроўні гучаць заклікі ўвесьці ў школах паралельна з навуковай біялёгіяй выкладаньне Бібліі. Справа не ў біялёгіі. Справа ў ідэалёгіі. Чытаць пра кветкі і падвіды птушак сумна. Нічога гераічнага і патаснага тэорыя Дарвіна вучням не падказвае. Яна вучыць разважаць і параўноўваць. Што ўжо само па сабе кепска.

Дыспут жа на ўзроўні «падабаецца паходзіць ад малпы — не падабаецца» выглядае бессэнсоўным. У адказ можна запытаць: няўжо амэрыканскі студэнт, які забіў трыццаць два чалавекі ва ўнівэрсытэцкім кампусе і сябе самога, выклікае больш сымпатыяў, чым любая малпа? Няўжо іншы забойца, які перад тым учыніў бойню ні ў чым не вінаватых і безабаронных сяброў хрысьціянскай абшчыны амішаў, заслужыў права называцца чалавекам?

І няўжо чалавек, як боскае стварэньне, мае права вынішчаць жывую прыроду, у тым ліку — тых самых малпаў, шмат відаў якіх засталіся ўжо толькі ў заапарках?

Але такія аргумэнты ня будуць пачутыя і ўлічаныя ў сучасным грамадзтве.

Як і той факт, што тэорыя эвалюцыі відаў не адмаўляе ідэю існаваньня Бога. Яна толькі зьняпраўджвае тэорыю катастрофаў, паводле якой жывёльны і расьлінны сьвет плянэты неаднаразова зьнішчаўся ў выніку геалягічных катаклізмаў, а потым узьнікаў наноў. Паводле Дарвіна, жывая прырода і супольнасьці жывых арганізмаў (экасыстэмы) — нашмат больш складаная рэч, чым гэта ўяўлялася да яго іншым навукоўцам. І дагэтуль уяўляецца многім людзям. У прыроды ёсьць шмат найтанчэйшых і найдасканалых мэханізмаў — зьменлівасьць, спадчыннасьць, барацьба відаў за выжываньне і іншыя, зразумець якія можна толькі шляхам цяжкай навуковай працы. Спачатку трэба карпатліва сабраць матэрыял, потым аб’ектыўна прааналізаваць яго. І толькі потым стварыць унутрана несупярэчлівую стройную тэорыю, якая, зноў-ткі, правяраецца практыкай.

Дарвін, між іншым, не настойваў на тым, што ён адкрыў ісьціну ў апошняй інстанцыі.

Ягоны сучасьнік, таксама біёляг, Томас Гэксьлі, які шмат зрабіў дзя прапаганды дарвінаўскай тэорыі, быў яшчэ і філёзафам-агностыкам. Гэксьлі, дарэчы, першым ужыў тэрмін «агнастыцызм». Агностык — гэта чалавек, які лічыць, што даказаць ці зьняпраўдзіць існаваньне Бога немагчыма ў прынцыпе. Прыхільнікі агнастыцызму не адмаўляюць існаваньня боскіх сутнасьцяў, але лічаць немагчымым дасягненьне абсалютнай ісьціны.

Агностыкаў, насамрэч, даволі шмат вакол нас. Але паспрабуйце ў прыстойнай кампаніі заявіць, што вы агностык. Вас, у лепшым выпадку, не зразумеюць. Калі выканаўца абавязкаў прэ’мер-міністра Расеі Ягор Гайдар ужыў гэтае слова ў дачыненьні да сябе

падчас тэлеінтэрвію — гэта паставіла канчатковы крыж на ягонай палітычнай кар'еры. Інтэлігент у Расеі нават меней, чым паэт. Гэта ізгой.

### «Наперад, да фэадалізму!»

Насамрэч, апісаныя вышэй выпадкі маюць толькі ўскоснае дачыненьне да рэлігіі, філязофіі і тым больш — біялёгіі. Але яны маюць дачыненьне да палітыкі. Ці — як у выпадках з «малпавым працэсам» у Дэйтане і з Машай Шрайбер — да піяр-кампаніяў.

А чаму пра іх успомнілася? У сувязі з тым, пра што пішуць апошнім часам апазыцыйныя выданьні пра беларускую апазыцыю. Зь Вільні нядаўна прыйшло паведамленьне, што лідэры дэмакратычных сілаў дамовіліся памяняць агульную стратэгію. А менавіта — перайсьці ад рэвалюцыйных мэтадаў да эвалюцыі і дыялёгу з уладай.

Цяжка сказаць, адкуль узялася гэтая інфармацыя. Наколькі вядома, ніхто з журналістаў на тым паседжаньні лідэраў апазыцыі за зачыненымі дзьвярыма не прысутнічаў. Дык ці правільна перадаецца сутнасьць тых дамоўленасьцяў? Але паколькі аб гэтым ужо многія пішуць, а з боку лідэраў няма зьняпраўджаньняў альбо тлумачэньняў, трэба думаць, што так яно і ёсьць. То бок будзем лічыць, што цяпер узяты курс на эвалюцыю.

Калі так, дык ці азначае гэта, што дагэтуль беларуская дэмакратычная апазыцыя йшла рэвалюцыйным курсам? Рэвалюцыя азначае скачок у развіцьці. Пад сацыяльнай рэвалюцыяй, паводле клясыкаў марксізму, маецца на ўвазе ня проста скачок, але пераварот, гвалтоўны захоп улады. Для гэтага, праўда, у грамадзтве павінны сасьпець перадпасылкі. Напрыклад — рэвалюцыйная сытуацыя. Ці ўзнікала ў Беларусі за апошнія дзесяць гадоў рэвалюцыйная сытуацыя? І ці быў хаця б намер у дэмакратычных партыяў захапіць уладу сілай? Альбо ня ўладу — хоць нейкі адміністрацыйны будынак: пошту, тэлефон, тэлеграф?

Калі ў некага былі ілюзіі на гэты конт, у сакавіку мінулага году яны павінныя былі канчаткова разьвеяцца.

Што ж тычыцца эвалюцыі, гэтая зьява, чаго б яна ні тычылася, мала залежыць ад волі асобных людзей. Гэта праваслаўныя крытыкі Дарвіна ў сучаснай Расеі лічаць, што сэр Чарлз быў масон, а ягоная тэорыя — частка сусьветнай жыдамасонскай змовы. З дарвінаўскай тэорыі як раз вынікае, што ніякія зьнешнія інфэрнальныя сілы эвалюцыю не выклікаюць і тым больш ёй не кіруюць. Эвалюцыя адбываецца паводле сваіх унутраных законаў. І ўсё.

Калі нехта з палітыкаў выступае пад лёзунгамі эвалюцыі, гэта нагадвае вядомы анэкдот. У старажытным Рыме адбываецца маніфэстацыя рабоў пад лёзунгам «Наперад, да фэадалізму!»

Калі ж падыходзіць да праблемы ўсур'ёз, дык хацелася б ведаць — што канкрэтна мае азначаць «новы курс» апазыцыі? Якія пытаньні яна прапануе вынесьці ў першую чаргу на парадак дня дыялёгу з уладай? (Калі сапраўды ёсьць такія пляны). Дзяржаўны лад? Сацыяльна-эканамічную палітыку? Стан беларускай мовы і культуры? Дачыненьні з Эўропай і Расеяй?

А які мэханізм меркаванага дыялёгу? Ці гатовая да яго ўлада? Або яе давядзецца ўсё-ткі прымушаць ісьці на дыялёг? Якім чынам? Мабыць, апазыцыйныя партыі ўсё-ткі не зьбіраюцца адмаўляцца ад палітычнай барацьбы і масавых пратэстаў? Інакш якія ж яны партыі?

Гэтыя пытаньні далёка не рытарычныя. Справа ў тым, што журналісты, як і ўсе нармальныя грамадзяне Беларусі, хацелі б аднойчы зразумець, у якой краіне мы жывем, хто будзе ёй кіраваць у будучыні і ў які бок яна будзе эвалюцыянаваць. Разам з уладай і апазыцыяй.

А можа, лепей узяць прыклад з Машы Шрайбер ды паехаць куды-небудзь на Антыльскія выспы, да дзікіх малпаў?

# Адкрыты ліст архітэктараў: Ператварэньне Бэрнардынаў у гатэль непрымальнае

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь,
Менгарвыканкам,
Кіраўніцтва справамі Прэзыдэнта РБ

Адкрыты ліст

У апошні час у некаторых СМІ зьяўляецца інфармацыя аб рэканструкцыі кляштару бэрнардынаў з прыстасаваньнем пад гатэльны комплекс. Гэта найбуйнейшы помнік архітэктуры XVII ст. гістарычнага цэнтру Менску з багатай гісторыяй і ўнікальным культурным пластом. Аднак праект «рэканструкцыі» сваёй сутнасьцю накіраваны на поўнае зьнішчэньне ўсёй аўтэнтычнасьці ўнікальнага аб'екту. У ім прадугледжана разьмяшчэньне паркінгу. Вялізныя аб'ёмы зямельных прац пацягнуць за сабою вываз на сьметнік у выглядзе будаўнічага сьмецьця культурнага пласта, які фармаваўся з часоў сярэднявечча, зьнішчэньне ўнікальнага дэкору будынкаў, што захаваўся да нашых дзён. Функцыя гэтага гатэлю прадугледжвае разьмяшчэньне ў былым кляштары забаўляльных аб'ектаў: казіно, боўлінгу, рэстарану, басэйну — што, па меншай меры, дзіўна. Нікога (ні праектоўшчыкаў, ні інвэстараў) не бянтэжыць нават суседзтва з галоўным праваслаўным комплексам краіны.

Нават калі канцэпцыя выявы аб'екту будзе зьмененая, згодна с пастановай выязнога пасяджэньня Рэспубліканскага Савету па пытаньнях гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 19 красавіка 2007 г., неабходна разгледзець альтэрнатыўнае функцыянальнае прызначэньне кварталу гістарычнай забудовы. Ні ў адной з эўрапейскіх сталіц, якія шануюць сваю гістарычную спадчыну, немагчыма знайсьці падобнага прыкладу разьмяшчэньня ў кляштары забаўляльных аб'ектаў. Тым больш што ў Менску такі гістарычны комплекс адзіны.

Пераканаўча просім перагледзець непрымальнае функцыянальнае прызначэньне кварталу гістарычнай забудовы, абумоўленага ў рашэньні Менгарвыканкаму ад 25 траўня 2006 г. №1012, з адпаведным пераглядам пляніровачнай канцэпцыі рэканструкцыі кляштару Бэрнардынаў.

Архітэктары:
Сарайкін А.М., Навумік І.М., Каляскоў А.А.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Славацкі цуд

Адзінства дэмакратаў і сумленная эканамічная палітыка зрабілі Славаччыну з паўдыктатуры цэнтральнаэўрапейскім тыграм. Піша чэскі журналіст **Любаш Палаты**.

Славаччына — адзіная краіна, дзе, калі размаўляеш па-чэску, цябе ня толькі зразумеюць, але ў дадатак палічаць за прадстаўніка багатага Захаду, расказваў я жартам ў праскіх піўных, калі сам жыў у Братыславе. За гэтыя два з паловай гады, з таго часу, як я зноў у Чэхіі, у Славаччыне шмат чаго зьмянілася. Калі ня ўсё.

Славаччына скончыла мінулы год амаль што дзесяціпрацэнтным эканамічным ростам, заробкі напрыканцы году ўпершыню перакрочылі мяжу 20 тыс. кронаў (каля 800 даляраў), а курс славацкай валюты з тыдня ў тыдзень расьце.

## Крона кроне роўная

Мінулі таксама часы, калі абавязковым было правіла: «Калі хочаш нечага дасягнуць у Славаччыне, мусіш паехаць на Захад ці хаця б у Прагу».

Шмат у якіх адносінах — зьніжэньня беспрацоўя і інфляцыі, балянсу замежнага гандлю, запазычанасьці краіны, прытоку замежных інвэстыцыяў — Славаччына гіганцкімі крокамі даганяе Чэхію. Чэскія аптэкі, шпіталі, супэрмаркеты, фабрыкі, тэатры і кінастудыі могуць мець у хуткім часе вельмі вялікія праблемы са знаходжаньнем супрацоўнікаў. Там на кожным кроку можна сустрэць славакаў, якія прыехалі працаваць у Чэхію, спакушаныя больш высокімі заробкамі. Дзякуючы двухбаковым дамовам славакам ужо з 1990-х не патрэбныя ніякія дазволы на працу. Паводле найбольш асьцярожных ацэнак, у Чэхіі жывуць і працуюць прынамсі 200 тыс. славакаў.

Адзінае што Чэхія, дзе сёньня сярэдні заробак складае таксама каля 20 тыс. кронаў, толькі чэскіх (каля 950 даляраў), перастае быць прывабнай для славакаў краінай. «Зразумела, мы гэта ўсьведамляем. На жаль, так яно насамрэч і ёсьць», — пачуў я ў брноўскай філіі адной вялікай міжнароднай кадравай агенцыі, калі я запытаўся, ці няма ў іх праблемаў з наборам славакаў для працы ў Чэхіі. Можна вызначыць гэта больш катэгарычна: розьніца ў заробках паміж чэхамі і славакамі сёньня ўжо практычна незаўважная. Апроч таго, у Славаччыне ўжо столькі прапановаў працы, што працадаўцы міжсобку спаборнічаюць.

## Братыслава — Вена

Пакуль што адзінае выключэньне — гэта мэнэджары сярэдняга і вышэйшага ўзроўню. Для іх Прага паранейшаму мае больш цікавыя прапановы. Асноўным чынам таму, што філіі вялікіх міжнародных карпарацыяў, як і раней, маюць свае офісы ў сталіцы Чэхіі і не пераяжджаюць у Славаччыну.

Прага, дзе жыве больш за мільён чалавек і якая ў мінулых гадах зрабілася месцазнаходжаньнем некалькіх дзясяткаў рэгіянальных філіяў сусьветных канцэрнаў, гэта фактычна крыху іншая рэч, чым трохі мяшчанская Братыслава, якая сваім паўмільёнам жыхароў абавязаная толькі велічэзным раёнам на ўскрайках гораду.

Калі б, аднак, — пасьля 15 гадоў пустой балбатні — атрымалася злучыць Братыславу з аддаленай усяго толькі на колькі дзясяткаў кілямэтраў Венай, зьнікла б таксама і гэтая чэская перавага. Праз год будзе нарэшце здадзеная аўтастрада зь Вены да Братыславы (будаўніцтва зацягнулася па віне аўстрыйцаў, славацкі ўчастак быў ужо гатовы пяць гадоў таму), а паміж сталіцамі Славаччыны і Аўстрыі пачне таксама езьдзіць — гэтак жа, як у часе паміж I і II Усясьветнымі войнамі, — хуткасны трамвай. Ужо сёньня славакі будуюць дамы ў аўстрыйскіх вёсках, разьмешчаных недалёка ад Братыславы, бо там будаўнічыя ўчасткі таньнейшыя.

Калі зь Вены і Братыславы ўзьнікне «двугорад», эканамічная моц аўстрыйскай мэтраполіі будзе азначаць геамэтрычны рост для сталіцы Славаччыны. Некалькі дзясяткаў праектаў закрытых пасёлкаў і небасягі, што растуць як грыбы пасьля дажджу, сьведчаць пра тое, што дэвэлапэры разглядзелі гэты шанец Братыславы.

## Славацкія вугорцы таксама скарыстаюцца

Славацкі эканамічны цуд, магчыма, азначае таксама істотную гарантыю тэрытарыяльнай цэласнасьці гэтай найменшай вышаградзкай краіны. Упершыню ў най-



Братыслава будуецца.

**Любаш Палата**

рэдактар чэскай газэты «Lidove Noviny», раней быў таксама намесьнікам галоўнага рэдактара славацкай газэты «Pravda».

ноўшай гісторыі Славаччына мае шанец абысьці ў разьвіцьці эканомікі ня толькі Чэхію, але і свайго спрадвечнага суперніка — Вугоршчыну.

У паўднёвай Славаччыне да сёньняшняга дня жыве вугорская меншасьць, а Будапэшт у апошнія гады вельмі намагаўся яе актывізаваць і падрыхтаваць да «нацыянальнай рэінтэграцыі ў найлепшым вугорскім горадзе». Славацкія вугорцы, якія езьдзяць на працу ў аўтамабільныя фірмы Вугоршчыны, пачынаюць заўважаць, што больш высокія заробкі яны маглі б атрымоўваць у падобных фірмах у Славаччыне. А Братыслава, якая ўзбагачаецца і ў якую пачынаюць прыязджаць вядомыя музычныя гурты, у хуткім часе будзе такой жа прывабнай, як і Будапэшт са сваёй выспай сьв. Маргарыты.

Пра тое, наколькі прынцыповы ўплыў на цэласнасьць дзяржавы можа мець эканамічны посьпех, сьведчыць прыклад паўночнай Італіі. Тамашняя аўстрыйская меншасьць перастала гаварыць пра аддзяленьне, калі ўзроўнем свайго жыцьця яна наблізілася да аўстрыйцаў, якія жылі на паўночным баку Альпаў.

Каб славацкія вугорцы пачалі сапраўды пачувацца «па-славацку», паўднёвая Славаччына павінна таксама чэрпаць выгаду з эканамічнага цуду апошніх гадоў. Замежныя інвэстыцыі трапляюць перадусім у раён Даліны Вагу і ваколіцы Братыславы. У рэгіёны, якія маюць ня толькі прамысловыя традыцыі, але таксама і сучасную інфраструктуру.

Дзякуючы будаўніцтву заводаў КІА пад Жылінай з паўночнай Славаччыны можна сёньня даехаць аўтастрадай да Братыславы, а праз Чэхію, Аўстрыю і Вугоршчыну трапіць ва ўсю Эўропу. У наступныя гады некалькі дзясяткаў мільярдаў кронаў пойдуць на завяршэньне аўтастрады з Жыліны да Прэшава і Кошыцэ. Невыпадкова гэтая аўтастрада вядзе праз гарыстую, паўночную частку Славаччыны. Аўтастрады праз поўдзень краіны можна было б пабудаваць ня толькі хутчэй, але і таньней. Але поўнач — чыста славацкая (калі не лічыць мясцовых цыганаў), у той час як поўдзень — «вугорскі».

У выніку пераадоленьне стокіляметровай трасы з Братыславы да Комарны — «сталіцы» славацкіх вугорцаў — цягнецца даўжэй, чым паездка ў разьмешчаную ў два разы далей Жыліну. А калі вугорац з паўднёвай Славаччыны хоча наведаць сваякоў альбо знаёмых, якія жывуць на поўдзень ад Кошыцэ, найбуйнейшага гораду усходняй Славаччыны, то ён зьберажэ час і нэрвы, калі паедзе па вугорскіх аўтастрадах праз Будапэшт. Калі, аднак, будзе працягвацца эканамічны посьпех Славаччыны, якая сёньня дзякуючы тром вялікім аўтамабільным заводам ёсьць найбуйнейшым вытворцам аўтамабіляў на сьвеце ў пераліку на аднаго жыхара, — то пры разумным урадзе ў Братыславе з часам таксама і славацкія вугорцы пачнуць чэрпаць выгаду з гэтага посьпеху.


Завод «KIA motors» у Жыліне сёлета зьбярэ 10 тысяч машын. Працуюць там 1700 чалавек, зь іх 18% — жанчыны.

## Бясьпечныя рэформы

Натуральна, што фундамэнтам славацкага цуду зьяўляюцца лібэральныя рэформы папярэдняга ўраду Мікуляша Дзурынды (2002-2006). Падаецца, аднак, што і цяперашні ўрад сацыяліста Робэрта Фіца паводзіць сябе разумна. Урад, які, апрача сацыял-дэмакратычнай групоўкі прэм’ера «Smer» (Курс), таксама складаюць «Рух за дэмакратычную Славаччыну» былога славацкага Лукашэнкі Ўладзімера Мэчыяра і Славацкая нацыянальная партыя скандальнага нацыяналіста Яна Слоты, праводзіць прагматычную эканамічную палітыку, працягваючы курс папярэднікаў.

Урад падпарадкаваў свае рашэньні як мага хутчэйшаму прыняцьцю эўра (да 2009 г.), што не дазваляе яму выдаваць болей, чым складаюць даходы з падаткаў. Рэкордны эканамічны рост стаў адначасова прычынай таго, што ўрад пакінуў лінейны падатак у памеры 19 адсоткаў. Урад не адмовіўся нават ад лібэральнай пэнсійнай рэформы, аснову якой складаюць індывідуальныя рахункі, а таксама прыватныя пэнсійныя фонды.

Для сваіх левых выбаршчыкаў Фіца ўвёў толькі некалькі касмэтычных зьменаў — зьнізіў цэны на лекі, адмяніў плату за выпіску рэцэптаў дактарамі, ліквідуючы адначасова льготы, павысіў падаткі для славакаў з найбольшымі заробкамі, спыніў таксама продаж дзяржаўнай маёмасьці.

Пры эканамічным росьце ў 10 % Славаччыне па сілах гэтыя зьмены. Гэта зразумелі сусьветныя канцэрны, якія плянуюць тут ужо чарговыя інвэстыцыі ў памеры мільярдаў кронаў. З малацікавай правінцыі Славаччына становіцца сапраўдным тыграм Цэнтральнай Эўропы.

**Пераклад Вольгі Данішэвіч паводле gazeta.pl**

# Беларускі нумар часопісу «Plav»

У Чэхіі выйшаў часопіс замежнай літаратуры «Plav», прысьвечаны Беларусі.

«Беларусь і літаратура на беларускай мове ёсьць адным з самых цікавых культурных фэномэнаў сучаснай Эўропы, — гаворыцца ў рэдактарскай прадмове. — Паводле дактрыны беларускай дзяржавы, беларуская мова наагул не павінна існаваць як жывая мова. Але ня ўсё адбываецца, як хацелі б моцныя. Мова жыве, яна стварае адмысловую супольнасьць хаўрусьнікаў, свой поліс».

У нумары — апавяданьні Васіля Быкава, вершы Алеся Разанава, эсэ Ўладзімера Арлова, успаміны Ларысы Геніюш, інтэрвію з Тацянай Процькай. Артыкулы Мар'яна Слободы і Сяргея Сматрычэнкі разглядаюць сучасную сытуацыю беларускай мовы.

**Радыё «Свабода»**




# Посьпех «Свабоднага тэатру» ў Вялікабрытаніі

Спэктакль беларускага «Свабоднага тэатру» «Быць Гаральдам Пінтэрам» атрымаў найвышэйшую адзнаку, пяць «зорак», ад брытанскай газэты «Гардыян». Тэатар браў удзел у канфэрэнцыі з нагоды 50-годзьдзя творчай дзейнасьці набэліста Гаральда Пінтэра. Спэктакль пастаўлены паводле чатырох п'ес Г.Пінтэра, фрагмэнтаў нобэлеўскай прамовы і ўрыўкаў зь лістоў затрыманых у Менску ў сакавіку 2006 г. на Кастрычніцкай плошчы.

**Паводле БелаПАН**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Спэктаклі «Свабоднага тэатру» ў Беларусі праходзяць падпольна. Калектыў ня мае ні ўласнай сцэны, ні фінансаваньня. На фота: сцэна з п'есы «Быць Гаральдам Пінтэрам».**

## СЬЦІСЛА

### Чаргінец раўназначны Караткевічу

УП «Мастацкая літаратура» плянуе выдаць у сэрыі «Жыцьцё знакамітых людзей» кнігі, прысьвечаныя Івану Шамякіну і старшыні праўладнай пісьменьніцкай арганізацыі Мікалаю Чаргінцу. У выдавецтве ня ведаюць, хто складзе том пра аўтара «Маёра Ветрава». Невядомыя і тэрміны выданьня. Раней у сэрыі выйшлі кнігі, прысьвечаныя Ўладзімеру Караткевічу, Міхаілу Пташуку, Уладзімеру Мулявіну, Леаніду Шчамялёву.

**СП**

### Начная опэра каля Сьвятой Сафіі

Падчас сьвяткаваньня 1145-годзьдзя Полацку ля сьценаў Сафіі загучыць начная опэра. У канцэрце 1 чэрвеня прагучаць арыі, клясыка, джаз, апэрэта. Квіткі за 25 тысяч рублёў будуць у Полацку і Менску.

**МБ**

# Прэзэнтацыя кніг Зянона

У нядзелю ў Нью-Ёрку прайшла прэзэнтацыя кніг Зянона Пазьняка, выдадзеных у эміграцыі. Увага была засяроджаная на зборніках паэзіі і фатаграфіяў «Глёрыя Патрыя», «Вялікае Княства» і «Дарога».

«Мяне вельмі ўзрушыла, што прыйшло шмат моладзі, і што, калі чыталі вершы, на вачах у людзей былі сьлёзы, — сказаў Пазьняк. — Дарэчы, гэтыя кнігі выдадзеныя цалкам на грошы беларусаў, пры падтрымцы беларускіх патрыётаў і на ўласныя сродкі. ...Не шкадую, што дваццаць гадоў таму фактычна кінуў творчасьць і заняўся палітыкай, бо жыцьцё прысьвяціў найвышэйшай справе — стварэньню новай дзяржавы. І гэтая дзяржава існуе. Хай сёньня ў ёй дыктатура — заўтра будзе вольная Беларусь. Галоўнае, каб Беларусь жыла».

Прадмовы да «Вялікага Княства» і «Дарогі» напісалі Р.Барадулін і А.Разанаў.

**Паводле Радыё «Свабода»**

## КАЛЯНДАР

# Травень

**1** — Дзень працы.

**3** — Міжнародны дзень свабоды друку.

**8** — Дзень Перамогі над нацызмам.

**15** — 125 гадоў ад нараджэньня Ўладзіслава Галубка: драматурга, рэжысэра, актора, заснавальніка вандроўнага тэатру, першага народнага артыста Беларусі.

**16** — У каталікоў успамін сьвятога Андрэя Баболі, апекуна Пінскай дыяцэзіі.

**17** — Ушэсьце ў праваслаўных і каталікоў.

**20** — Дзень незалежнасьці Ўсходняга Тымору.

**27** — Сёмуха ў праваслаўных і каталікоў.




### ЗЯНОН

Беларусь
Тая Беларусь,
Да якой ішоў зь юнацтва,
Ужо відаць на гарызонце.
Ці гэта міраж?
Госпадзе, яшчэ б толькі адно жыцьцё!

*2007*

Іншыя вершы Зянона, а таксама Генадзя Бураўкіна, эпісталярыі Васіля Быкава, проза Альгерда Бахарэвіча і Сакрата Яновіча, эсэ Сяргея Дубаўца — у новым «Дзеяслове» №2.


АРХІЎ АЛЕГА ГАРДЗІЕНКІ

# Гай Пікарда

У маёй памяці ён назаўсёды застанецца добрым духам лёнданскай Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны. Паводле аналёгіі з дамавіком і лесавіком, у адным з сваіх падарожных эсэ я так і назваў яго — бібліятэчнік. Пагатоў, падчас нашага знаёмства там, у Скарынаўцы, спадар Гай — невысокі і круглявы, як казачны Карлсан, — сапраўды зьлёгку напалохаў мяне, бясшумна выглянуўшы позьняй вечаровай парою з-за кніжных паліцаў.

Адзін з продкаў Гая Пікарды, які служыў у Вялікай арміі Напалеона, пасьля кампаніі 1812 году вярнуўся дахаты з адмарожаным недзе на Смаленшчыне вухам. Ашчадна захаваны ў табакерцы трафей беларускіх маразоў ператварыўся ў сямейную рэліквію, што, калі верыць Пікарду, і змусіла яго аднойчы знайсьці на мапе Смаленск і Менск, а потым завітаць у Беларускую грэка-каталіцкую царкву Пятра і Паўла ў Лёндане, каб на ўсё жыцьцё захапіцца вуніяцкімі сьпевамі і нашай гісторыяй. (Дарэчы, два апошнія дзесяцігодзьдзі ён і пражыў у беларускім цэнтры ў лёнданскім Фінчлі).

Нашчадак старадаўняга брэтонскага роду, выхаванец Оксфардзкага й Сарбонскага ўнівэрсытэтаў, ён памяняў адвакацкую практыку на навуковыя студыі й зрабіўся знаным у сьвеце беларусістам.

Кола ягоных навуковых зацікаўленьняў было надзвычай шырокім: ад царкоўнай музыкі і творчасьці Міколы Равенскага да гісторыі перакладаў Бібліі на беларускую мову і Скарынавых заняткаў кабалістыкай. Пікарда знайшоў Супрасьлеўскі і Жыровіцкі ірмалоі XVI ст., выдаў некалькі беларускіх духоўных сьпеўнікаў, у тым ліку анталёгію «Залатая Беларусь». У 1960-я ён выкладаў музыку і сьпевы ў лёнданскай беларускай школе імя Кірылы Тураўскага. Пакуль дазваляла здароўе, спадар Гай прыяжджаў у Магілёў на музычны фэстываль «Магутны Божа» і казаў, што кожная вандроўка ў Беларусь робіцца для яго магутным стымулам, каб пражыць яшчэ год і дачакацца наступнай.

Блізкае сяброўства зьвязвала яго зь выбітным дасьледнікам беларускай літаратуры ў ангельскамоўным сьвеце прафэсарам Арнольдам Макмілінам. За гасьцінным Арнольдавым сталом два гады таму я апошні раз чуў утульны Гаеў рогат, захапляўся яго праніклёным выкананьнем беларускіх песьняў, не ўтрымаўся ад сьмеху, зноў выслухаўшы ягоную ўлюбёную показку пра Напалеона і беларускую бабулю, у якой валадар Эўропы запытаўся, чаго тая жадае: каб французы пагналі расейцаў далей, або расейцы пагналі французаў назад. «І тады ваша мудрая бабушка, — бліскаў вачыма дасьціпны брэтонец, — сказала: «Хачу, каб французы загналі маскалёў так далёка, каб не вярнуліся ні адны, ні другія».

Зямны шлях Гая Пікарды завяршыўся 21 красавіка ў Лёндане на 76-м годзе жыцьця.

Ён любіў Беларусь.

Мы будзем памятаць яго.

**Уладзімер Арлоў**

**Гай Пікарда** нарадзіўся 20 ліпеня 1931 г. у Лёндане ў сям'і брэтонца-француза і ангелькі ірляндзкага паходжаньня. Вучыўся ў Сарбоне ды Оксфардзе, атрымаў юрыдычную адукацыю. Дваццаць гадоў адпрацаваў адвакатам у францускай амбасадзе ў Лёндане.

У дзяцінстве цётка, хрышчаная габрэйка зь Вільні Рэната Палонская, прывяла Пікарду ў праваслаўны сабор у Парыжы, дзе хлопец пачуў царкоўныя сьпевы, якія захапілі яго. У Лёндане ён стаў сьпяваць у праваслаўным хоры, зьбіраў царкоўную музыку. Пікарда некаторы час быў і сакратаром таварыства культурных сувязяў з СССР. «Я быў крыху камуністам», — прызнаваўся ён.

Аднойчы Пікарда ладзіў канцэрт, для якога атрымаў песьні ад украінцаў і расейцаў. Лёнданскія ўкраінцы прапанавалі ўключыць у праграму і беларускую музыку і скіравалі яго да біскупа Чеслава Сіповіча, шэфа Беларускай каталіцкай місіі ў Вялікабрытаніі. Так Пікарда пазнаёміўся зь беларусамі, прыбіўшыся да іх на ўсё жыцьцё.

У канцы 1950-х Пікарда паехаў з экспэдыцыяй на Падляшша. У Кляшчэлях, Сямятычах, Супрасьлі зьбіраў старажытныя беларускія царкоўныя сьпевы. Свае запісы ён перасылаў у ЗША Міколу Шчаглову-Куліковічу для гарманізацыі. Вынікі дасьледніцкай працы Гай Пікарда публікаваў па-ангельску і па-беларуску, выйшлі «Беларускі царкоўны сьпеўнік Сьв. Літургіі» (1979—1991, кн. 1—2), «Беларускі духоўны сьпеўнік» (1989), навукова-папулярнага выданьня «Царкоўная музыка на Беларусі 989 — 1995» (1995).

Гай Пікарда быў сакратаром Англа-беларускага таварыства. Дапамагаў у арганізацыі беларусаведных лекцыяў, выданьні англамоўнага часопіса The Journal of Byelorussian Studies, стварэньні Беларускага музэю ў Лёндане. Склаў даведнік пра Бібліятэку імя Скарыны ў Лёндане (1971).

Акрамя гісторыі музыкі Пікарду цікавілі жыцьцё і дзейнасьць Скарыны, гісторыя беларускіх перакладаў Бібліі, духоўная культура і права ў ВКЛ і іншыя тэмы.

Гай Пікарда адкрыў беларусам гісторыю друкара Яна Ліцьвіна, дасьледаваў ангельскі пэрыяд жыцьця Аляксандра Рыпінскага, адшукаў дом, дзе была яго друкарня, лёнданскія беларускія выданьні ды зробленыя ім фатаздымкі ў брытанскіх музэях. Ён знайшоў брытанскі сьлед сястры Вацлава Іваноўскага Галены і аднавіў гісторыю зацікаўленага ў беларушчыне кола арыстакратаў з Кембрыджу пачатку XX ст.. А яшчэ Пікарда дасьледаваў ангельскія сувязі славутай мэцэнаткі Магдалены Радзівіл і наагул роду Радзівілаў.

Ён сам вызначаў сабе праблемы для дасьледаваньняў і імкнуўся вырашаць іх. І абавязкова публікаваў вынікі. Ад 1997 г. ён цягам колькіх гадоў у адзіночку рабіў англамоўны часопіс Byelorussian Chronicle: пісаў і зьбіраў для яго матэрыялы, дадаваў здымкі, афармляў і памнажаў асобнікі.

Гай дэ Пікарда заўсёды дыстанцыяваўся ад палітыкі, падкрэсьліваючы, што Беларусь яго цікавіць цалкам, без залежнасьці ад тае ўлады, што сядзіць у Менску.

**Натальля Гардзіенка**

# КРЫЖАВАНКА



**Па вэртыкалі:** 1. 3-ці альбом «Мясцовага часу» — «Наша ...». 2. Прозьвішча клявішніка й бэк-вакаліста «Крамы» на альбоме «Камэндант». 3. Найбуйнейшая ў краіне прадусэрная кампанія, на чале якой стаіць Віталь Супрановіч. 4. Той, хто карыстаецца неабмежаванай уладай; герой песьні ULIS'а з альбому «Люстэрка». 5. Абрэвіятура — назва гурту, што на трыб'юце N.R.M. выканаў песьню «Бывай!». 7. Аўтар кнігі «Іх мроя. Іх N.R.M.». 8. Вядомы беларускі бард, аўтар тэкстаў альбому «WZ-orkiestra», «Паравіны году». 10. Баявая адзінка, тып вершаскладаньня і назва альбому Neuro Dubel. 11. Гурт-легенда, што выдаў кружэлкі «Чужаніца», «Краіна доўгай белай хмары» й «Танцы на даху». 12. Імя вядомага беларускага музычнага крытыка, аднаго з аўтараў кнігі «222 альбомы...». 13. Назва песьні «Гарадзкіх» з «гішпанскім» матывам у словах. 15. Прозьвішча лідэра гурту «Воплі Відоплясова». 17. Белы клён, які натхніў Янку Купалу на цудоўны верш, а песьняроў на яго музычнае адухаўленьне. 20. Удзельнік фольк-дуэту, што прымаў удзел у «Эўрабачаньні» ад Беларусі. 22. Мянушка басіста Zet'у. 24. Фольк-праект, у якім у свой час бралі ўдзел Піт Паўлаў і Зьміцер Вайцюшкевіч. 25. Імя Кірчука. 26. Шматгадовы лідэр-генэрал гурту ULIS. 27. Ён здольны, ён вольны, ён непарушны ў песьні ND (імя). 30. Лідэр-вакал «Палацу». 31. Горад, у які бег цягнік у песьні ULIS'у. 34. «У ... калі мы былі, справы нас не клапацілі» (Стары Ольса). 35. Назва першага альбому N.R.M. 36. Кіраўніцтва тэатральнага гуртку і музычнае сэкцыі ў п'есе «Дом культуры» (сапраўднае прозьвішча). 40. Лідэр гуртоў Pete Paff і «Гарадзкія». 41. Імя лідэра трох гуртоў і шматразовага ўладальніка рок-каронаў. 44. Краіна, зь якой паходзяць гурты «Скрябін» і «Тінь Сонця». 47. Імя вядоўцы забароненай радыёвэрсіі гіт-параду «Тузін гітоў». 48. «Кароль раёну», Сірожа ды проста «Ляпіс». 51. «...доўгай белай хмары» (ULIS). 55. Назва гурту-ўдзельніка праекту «Альтэрнатыва_by» («Народная»). 57. «Па-за смугой твой шэры ..., быццам бы вакно ў іншы сьвет» (ULIS). 58. Імя лідэра-вакаліста гурту «Крама».

**Па гарызанталі:** 2. Незалежны ад музыкі ход падзей, зьбег абставінаў. 3. «Наварыла ... ежы, каб гасьцей частаваці» (Харлі). 6. Гумарыстычная радыёперадачка Вольскага й «Ягоных запрошаных госьцікаў». 9. Краіна, у якой нарадзіўся чалавек і грамадзянінам якой ён зьяўляецца, ды «як стомленая жанчына», на думку Zet'аўцаў. 10. Назва тэхнічнае адзінкі й песьні N.R.M., што «дарма працуе» ў гэтай краіне. 13. Рок-кароль-98, лідэр Neuro Dubel (першасны варыянт напісаньня прозьвішча па-беларуску). 14. Паметка ў пашпарце, як дазвол на ўезд у чужую краіну або выезд зь яе, у тым ліку й у N.R.M. 16. Імя лідэркі гурту «Індыга». 18. «... ў стужцы пра лёс, дубляў больш няма» (ULIS, «Чужаніца»). 19. «Жыгімонт ...» (назва вядомага гурту). 21. «Кутата-...» — народнае афрыканскае сьвята зь песьні «Крамбамбулі». 23. Імя бубнача ULIS'у ўзору 1989 г. падчас выданьня першага альбому. 24. Кавалак завостранага дрэва або мэталу, які «забіваюць» паміж гуртамі «нядобрыя журналісты». 26. Імя лідэркі гурту «Новае неба». 28. Легендарны гурт-бацька N.R.M. 29. Чутнасьць гукаў у якім-небудзь памяшканьні (напрыклад, у канцэртнай зале). 32. Назва гурту, у якім удзельнічаюць Вольскі, Міхалок і Кулінковіч. 33. Адзін з тых, хто прымаў удзел у «бойцы на лузе» («Народны альбом»). 37. Трэці трэк на альбоме N.R.M. «Дом культуры» пра тое, што «было заўсёды». 38. «Мая ... — сэнтымэнтальнасьць» (N.R.M. «Тры чарапахі») (напісана «наркамаўкаю»). 39. Стыль музыкі, якім можна аб'яднаць гурты «ЧпБ», Imperator ды хлопцаў з «Партызанскае школы» ў адно цэлае. 42. «Мазырскі» гурт-легенда «Мясцовы ...» (Мазыр — горад, дзе быў выдадзены альбом «Наша ўскраіна»). 43. Бас-гітарыст N.R.M. 45. Цёмнае, сьветлае, безалькагольнае ды яшчэ ў песьнях «Крамбамбулі». 46. Прозьвішча музыкі гурту Neuro Dubel, як пазначана на альбоме «Танкі». 49. «Лепей я зрабіў жыцьцё, я пранёс у ...» (ND). 50. Малады гурт, што прапаноўвае «хутчэй пабудаваць дарогу ў незвычайны рай». 52. Фольк-гурт, які склаў дуэт разам з Аляксандрам Памідоравым для трыб'юту Depeche Mode. 53. Бесьсьмяротны гіт N.R.M. «Паветраны ...». 54. Легендарная песьня ULIS'у — «Пан ...», што ўвайшла ў перавыданьне альбому «Чужаніца». 56. Назва фольк-гурту, які быў створаны ў 1992 г., пасьля ўзнагароджваўся прызамі на фэстах «Басовішча», «Суклегас», «Азія даусы» і інш. 57. Вядомае этна-трыё з Кірчуком. 59. Пераможцы «Басовішча-2004», апошні рэліз — самотнік «Заенька». 60. «На кухонным стале танчыць чорная ...» (гіт ад «Новага неба» на словы Глёбуса). 61. Музычны інструмэнт, якім у дасканаласьці валодае Сяргей Ахрамовіч. 62. Супярэчлівыя рок-каралі-2006 «J_...».

**Адказы:**

**Па вэртыкалі:** 1.Ускраіна. 2.Лявончык. 3.БМА. 4.Уладар. 5.СКД. 7.Дзятліковіч. 8.Камоцкі. 10.Танк. 11.Уліс. 12.Вітаўт. 13.Карамба. 15.Скрыпка. 17.Явар. 20.Канстанцін. 22.Акрабат. 24.Крыві. 25.Іван. 26.Корань. 27.Сёма. 30.Хаменка. 31.Нясьвіж. 34.Карчма. 35.Лалалала. 36.Бабак. 40.Паўлаў. 41.Лявон. 44.Украіна. 47.Алег. 48.Міхалок. 51.Краіна. 55.Сад. 57.Твар. 58.Ігар.

**Па гарызанталі:** 2.Лёс. 3.Бабуля. 6.Квадракола. 9.Айчына. 10.Трактар. 13.Кулінковіч. 14.Віза. 16.Руся. 18.Акторка. 19.Ваза. 21.Мутата. 23.Кірыла. 24.Клін. 26.Кася. 28.Мроя. 29.Акустыка. 32.Крамбамбуля. 33.Казік. 37.Вайна. 38.Ментальнасць. 39.Рэп. 42.Час. 43.Ляўкоў. 45.Піва. 46.Наўмаў. 49.Паліто. 50.Крок. 52.Гаер. 53.Шар. 54.Руст. 56.Палац. 57.Троіца. 59.Індыга. 60.Котка. 61.Баян. 62.Морс

# Дзякуй

**Ліане Ш., Л.К., Лідзіі Л.** зь Менскага раёну.

**Анатолю К.** зь Любанскага раёну.

**Юліі Е.** з Навагрудзкага раёну.

**Ігару Б., Георгію С.** з Воршы.

**Вадзіму Б.** са Сьветлагорску.

**Міхаілу К.** зь Пінскага раёну.

**Натальлі І.** з Асіповіцкага раёну.

**Ганьне Р., Ігару С.** з Валожынскага раёну.

**Уладзімеру К.** з Барысава.

**Сяргею С., Сяргею Ц., Барысу В., Валер'ю П., Г.Р.** з Баранавіч.

**А.К.** з Чэрвеньскага раёну.

**Сяргею П., Сяргею Д.** зь Лідзкага раёну.

**В.В., Леаніду А., Андрэю К., Тадэвушу Ш.** з Маладэчна.

**Ігару М., Тацяне Б., Базылю К., А.Б.** з Магілёва.

**Станіславу С.** са Жлобіна.

**Сяргею К., Сяргею Т., Віктару А., Зьмітру П., Сяргею Б., Андрэю М., Канстанціну П.** з Гомелю.

**Ірыне Ц.** з Жыткавіцкага раёну.

**Аляксандру Т., Аляксандру К., Г.К., Людміле М.** з Горадні.

**А.Б.** з Ваўкавыскага раёну.

**Уладзімеру П., А.Ш.** з Аршанскага раёну.

**Андрэю Н., А.А.** з Полацку.

**Міхаілу М.** са Стаўпецкага раёну.

**Георгію С., Тамары К.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Я.Б.** з Глыбоцкага раёну.

**Фёдару Г.** з Мазыру.

**Н.Б., Зьмітру К.** з Мастоў.

**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.

**Зьмітру Ш., М.К., Уладзімеру Г., Алесю М.** з Наваполацку.

**Сяргею Л., Леанарду М.** зь Берасьця.

**Сяргею У., Алене Г.** з Бабруйску.

**Паўлу С.** з Горацкага раёну.

**Сьвятлане К.** зь Ліды.

**Р.Т.** з Пружанскага раёну.

**К.Ш.** з Браслаўскага раёну.

**Г.С.** зь Мядзельскага раёну.

**Альфонсу Р.** з Шаркоўшчынскага раёну.

**Міхаілу З.** зь Віцебску.

**Людміле Р.** з Капыльскага раёну.

**Валянціне Г.** зь Бешанковіцкага раёну.

**Анатолю П., Антону Т.** з Жодзіна.

**Уладзімеру В.** з Кобрынскага раёну.

**Генадзю М.** з Салігорску.

**Ю.Ф., Але Т., Мікалаю А., А.А., Міхаілу М., Алегу А., Н.Б., К.Л., Сяргею Ш., В.Л., Натальлі Б., Л.С., Аляксандру З., Т.П., Алегу М., Георгію Ш., Генадзю Ш., Ігару Г., В.Дж., Уладзімеру З., Сяргею П., Е.М., Сьвятлане К., Андрэю С., Валянціне Г., Маўлюдзе А., Паўлу Д., І.П., Рыце Н., Віктару К., А.К., Аляксандру П., Валянціне Ш., Е.С., Яўгену Л., Юр'ю Ч., Мікалаю М., І.К., Максіму Б., І.З., Уладзімеру С., Ю.Л., Сяргею Ф., Уладзімеру Ж., Андрэю Ш., Аляксандру Б., Максіму К., Аляксандру Н., Багуславу У., Анатолю Г., Фэліксу Б., Ю.Л., Віталю З., Галіне К., С.Р., Ігару А., І.С., В.В., А.К., А.Л., Д.М., С.С., Ільлі Ч., Уладзімеру І., Уладзімеру Р., Л.Г., Яўгену Л., С.Л., Людміле І., Глебу Х., Анатолю С., Алене С., В.А., Уладзіславу Ж., Івану Н., А.С., Яўгену К., Сьвятлане Г., Натальлі Ц., В.Л., А.Б., Сьвятлане Ш., Але Г., Сяргею К., Валер'ю Д., Эдуарду К., Лідзіі К., Зьмітру К., А.П., Тамары Л., Валянціне Ш., Эле С.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **перахазваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перахазу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перахажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перахажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

## За чысьціню мовы

**Некалькі памылак з публікацый у газэце.**

«Апошнія гады часта задаюся пытаньнем: што такое свабода?» У нашай мове «задавацца» — гэта прыблізна тое, што ў расейскай «гордиться». Правільна ў вас у тым самым нумары: «Аднак у Менску ніхто не задаваў такіх пытаньняў».

***

«...начальству, якое спавядае толькі адзін прынцып...» Спавядаюць грэшніка (чалавека), а прынцыпаў прытрымліваюцца (або парушаюць) бяз споведзі.

***

«А беларускую мову вучаць расейцы й бураты». Вучаць вучняў, студэнтаў, а мову вывучаюць. У вас пераклад непісьменнага расейца. У вас жа ёсьць і: «У віленскіх тралейбусах вучаць мовам» (тут жа людзей вучаць, а ня мову)

***

«У 1982 паступае ў Рыскую духоўную сэмінарыю, сканчае ў 1987». Дзеяслоў «скончыць» закончанага трываньня, таму ён ня мае формы цяперашняга часу, як і «кончыць». А вось «канчаць» — мае: я канчаю, ён канчае. «Закончыць» таксама ня мае цяперашняга часу, а «заканчваць» — мае: заканчвае. Вось і выбірайце: канчае, заканчвае. Тут няма ні складанасьці, ні ідэйнай падкладкі.

**І.Крамко, Менск**

## Замест лінгвістычнае нататкі

Рупліўцам нашаніўцам —
Сяргеям і Андрэям —
Хачу я пакланіцца
За слова,
што нас грэе.

Чытаю «Нашу Ніву» —
Шукаю нашай мовы...
А рады і шчасьлівы —
Ня з кожнае абновы.

У Вільні, Пецярбурзе
Ясьнеўся шлях да волі:
«Мы — беларусы, людзі!
У служках быць даволі!»

Пісаў «*у Пецярбурзе*»
Змагарны Цішка Гартны.
Казаць і я так мусіў
Ад школьнай лаўкі-парты.

У слове *Пецярбурзе*
Зьвінела *зь* так наска,
Нібы ў зялёным лузе
Пчала над зёлкай-краскай.

«Працуе ў *Пецярбургу*» —
Сказ гэты з «Нашай Нівы»...
*Быть ближе к брату-другу*
Нас хіляць мовазьлівы.

Ня з вас, малойцы-хлопцы,
Псаваньня моў пачатак...
Дай Бог вам духу, моцы
Вярнуць нам
наш канчатак!

**Дзед-чытальнік, Менск**

***

**Рады атрымоўваць Вашу газэту.** Нават навучыўся яе ўладкоўваць, каб не губляць старонкі: складваю, зьверху расьпілоўваю... і атрымліваецца часопіс. А пасьля чытаю. Чытаю запоем. Вось толькі з маімі падсьлепаватымі вачыма такі шрыфт замалаваты. А калі ўлічыць, што Беларусь «старэе», дык такое пажаданьне да рэдакцыі — зрабіць шрыфт буйнейшым — ня толькі маё, але, лічу, і іншых.

Трымайцеся, мае даражэнькія! Як можна трымайцеся! Вы патрэбныя маёй Бацькаўшчыне!

З павагай да Вас,

**Іван Цімафейчык, Мадзейкі (Зэльвенскі раён)**

**Прыміце шчырыя віншаваньні з нагоды 100-гадовага юбілею любімай беларусамі газэты «Наша Ніва»!**

Дай Бог і кожнаму з Вас адзначыць свой асабісты 100-гадовы юбілей!

Журналісты-нашаніўцы
Разгарнулі свае крылцы,
Сто гадоў яны ў палёце
На адказьнейшай рабоце.

«Ніва» наша засьпявала
Зь лёгкае рукі Купалы.
Зьверху сыплюць ёй атруту,
«Ніва» ж — рэжа праўду крута!

**Уладзімер Місьцюк, в.Дулічы**

## Пустата спараджае пустату

**Водгук на артыкул Віталя Тараса «Зьяўленьне пустаты народу» ў №7 «НН».**

Адна рэгіянальная расейскамоўная газэта на прапанову нейкага маладзёна пад нікам «арцём» на мясцовым інтэрнэт-форуме адкрыла рубрыку «чего не хватает нашему городу». Задумка слушная, адгукнулася некалькі дзясяткаў чытачоў, сыгналы адзінаццаці зь іх рэдакцыя надрукавала, з указаньнем псэўданіму і ўзросту аўтараў. Прачытаў іхныя сыгналы і падумаў: у самую, як кажуць, кропку трапіў Віталь Тарас сваёй публікацыяй. Што ні сыгнал, то ўбогасьць думак, пажаданьняў, развагаў — нібыта людзі жывуць ня ў цэнтры краіны, а недзе ў расейскай глыбінцы.

Нейкая 45-гадовая Ізабэла лічыць, што гораду не стае «монорельса до Минска». Ні болей, ні меней!

17-гадовы Аляксей і 19-гадовая Волька перакананыя, што гораду пара б займець начныя магазыны (вядома ж, маецца на ўвазе і тое, каб там прадавалі алькаголь) і «ночных девочек».

Тая ж Ізабэла ў роспачы ад таго, што ў гарадзкім парку мала ўтульных кавярняў, хоць іх там аж дзьве, даволі ўтульныя, з эўрапейскім дызайнам у афармленьні заляў, якія часта даволі пустыя, таму моладзь, якая наведвае паркі, з надыходам цяпла лічыць за лепшае расьпіваць алькаголь на шматлікіх лаўках, пакідаючы вакол іх кучы пустых бутэлек і папяровых шкляначак.

Яшчэ два 30-гадовыя чытачы выказалі пажаданьне, каб горад займеў кальян-бар, кегельбан, месцы для сямейнага адпачынку кшталту менскіх «дынатопій», кінатэатар для дэманстрацыі фільмаў «Кінг Конг», «Хон Гіль Дон», «Вій», «Кінг Конг жывы».

А завяршае гэты варты жалю пералік пажаданьняў рэпліка 30-гадовага жыхара пад псэўданімам «пасат»: гораду не хапае... «мазгоў». Тут ужо ёсьць нагода для разважаньняў. З улікам таго, што газэта выходзіць накладам звыш 7 тысяч асобнікаў, якія, акрамя Слуцкага, разыходзяцца яшчэ ў чатырох суседніх раёнах праз шапікі і нанятых распаўсюднікаў, складваецца ўражаньне, што многім чытачам сапраўды не стае мазгоў, каб паглядзець на навакольнае жыцьцё далей за ўласны нос.

Ніхто не даслаў сыгналу пра заняпад роднай мовы, культуры, нацыянальнай сьвядомасьці ці пра тое, што за апошнія дванаццаць гадоў, калі ўсе школы ў горадзе, а іх аж трынаццаць, плюс тры каледжы, усе дзіцячыя садкі сталі расейскамоўнымі.

Гораду не стае помніку слуцкім паўстанцам, якія ў лістападзе 1920-га году зладзілі Збройны чын супраць нашэсьця бальшавіцкай арміі і падзелу Беларусі паміж Польшчай і Расеяй. Тады адусюль пайшлі на сьмерць, каб жыла Беларусь, 10 тысячаў ваяроў, і мала хто зь іх пазьней ацалеў.

У цэнтры гораду не хапае новага праваслаўнага сабору, замест узарванага бальшавікамі ў 1935 г. Сьвята-Мікалаеўскага сабору, самага прыгожага храму на Замкавай гары, на месцы якога потым узьвялі самы нягеглы ў архітэктурным абліччы Дом культуры, да якога ў 70-я гады дабудавалі новы будынак, болей умяшчальны.

Ніхто не пасыгналізаваў, што ў горадзе на магазынах, канторах, дзяржаўных установах шмат расейскамоўных шыльдаў, што ў суполцы Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны большасьць членаў — пэнсіянэры, няма моладзі і ніводнага працуючага настаўніка.

Невыпадкова, калі кожны год у канцы лістапада адзначаюцца чарговыя ўгодкі Збройнага чыну, то праводзіць іх прыязджаюць госьці зь Менску, Салігорску, Магілёва, як было летась. А зь мясцовых прыходзіць чалавек дванаццаць-пятнаццаць пэнсіянэраў ды купка маладых людзей зь ліку школьнікаў старэйшых клясаў. І так доўжыцца ўжо з 1992 г., калі ўпершыню на гадавіну Збройнага чыну ў Слуцак зь Менску прыбыло з маладымі актывістамі Адраджэньня аж шэсьць аўтобусаў «Ікарус»...

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Шмат сэнсаў Рэспублікі

Рэч Паспалітая — наш каштоўны вопыт. Піша **Алег Дзярновіч.**



### Нашыя абшары

На захадзе гэтая дзяржава, Рэч Паспалітая, суседнічала з Брандэнбургам і Прусіяй, а на ўсходзе — з Расеяю. Вялікае Княства Літоўскае праз Інфлянты межавала са Швэцыяй. Польшча (ці, як яе называлі, Карона) суседнічала з габсбурскімі краінамі (Чэхія, Вугоршчына), а празь Дзікае Поле, Малдову і Сямігародзьдзе абедзьве дзяржавы кантактавалі з Крымскім ханствам ды Турэччынай. У часы найбольшага тэрытарыяльнага пашырэньня плошча Рэчы Паспалітай дасягала блізка 1 млн кв. км (990 000), зь іх на Вялікае Княства (ужо без украінскіх ваяводзтваў) прыпадала траціна: разам з Смаленшчынай у першай палове XVII ст. плошча ВКЛ складала 380 тыс. кв. км, а ад 1678 г. — 306 тыс. кв. км і ўжо не зьмянялася амаль стагодзьдзе, да падзелаў Рэчы Паспалітай.

Апроч уласна тэрыторыі Рэчы Паспалітай у леннай залежнасьці ад Польшчы з 1525 г. знаходзілася Прусія. Ад 1561 г. у падвойным лене (Польшчы і ВКЛ) была Курляндыя (Заходняя Латвія). «Малыя» Інфлянты (Паўднёва-Усходняя Латвія) зьяўляліся кандамініюмам — сумесным валоданьнем ВКЛ і Польшчы. У той ці іншай сувязі з Рэччу Паспалітай знаходзіліся румынскія княствы Валахія і Малдова. Увесь час не сьціхалі інтрыгі вакол чэска-нямецкай Сылезіі. Такім чынам, адміністрацыйны і палітычны ўплыў Рэчы Паспалітай пашыраўся за яе межы.

Колькасьць жыхароў абедзьвюх дзяржаваў Рэчы Паспалітай, Кароны Польскай і Вялікага Княства Літоўскага, пры канцы XVI ст. дасягала каля 7,5 млн. чалавек — у Эўропе ці навакол яе болей людзей жыло ў Францыі, Нямеччыне, Італіі, Расеі, Гішпаніі ды Турэччыне. У першай жа палове XVII ст. колькасьць жыхароў дасягнула 10 млн. Каля паловы зь іх складалі палякі. Перад Люблінскай уніяй (1569 г.) насельніцтва Вялікага Княства дасягнула 3 млн. Пасьля ж заключэньня уніі, калі паўночна-ўкраінскія землі адышлі да Польшчы, у ВКЛ засталіся жыщь 2,6 млн. чалавек. Да сярэдзіны ж XVII ст. працягваўся пэрыяд дэмаграфічнага росту, у Літве і Паўночна-Заходняй Беларусі шчыльнасьць насельніцтва наблізілася да максымуму, які забясьпечваўся тагачасным узроў-

**Працяг на старонцы 20.**




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя–Культура–Рэлігія–Палітыка–Авантура–Гэроіка–Успамін / Укладальнік Алег Дзярновіч. — Менск: І. П. Логвінаў, 2007. — (Кнігарня «Наша Ніва»)

# Шмат сэнсаў Рэспублікі

Працяг са старонкі 19.

нем гаспадаркі, — 16—20 чалавек на квадратны кілямэтар. На 1650 г. у Вялікім Княстве пражывалі 3,1 млн. чалавек, зь іх у Літве — каля 920—950 тыс., у Беларусі — 2,1 млн. Пасьля войнаў і дэмаграфічнага крызісу другой паловы XVII — пачатку XVIII ст. насельніцтва Рэчы Паспалітай зноў пачало расьці і ў другой палове XVIII ст. дасягнула ўзроўню сярэдзіны XVII ст. Але ўсе пэрыяды ў рамках Рэчы Паспалітай колькасьць насельніцтва Польшчы пераважала над колькасьцю жыхароў ВКЛ.

Вось так паводле вонкавых прыкметаў выглядала дзяржава, утвораная ў выніку падпісаньня Люблінскай уніі 1 ліпеня 1569 г. Ад уніі выйгралі і прайгралі ўсе бакі. Вялікае Княства страціла ўкраінскія землі, але амаль цалкам спыніліся набегі крымскіх татараў і зьнікла пагроза маштабных войнаў з Турэччынай. Пры дапамозе Польшчы ў Інфлянцкай вайне адбыўся пералом, і, мяркуюць дасьледчыкі, менавіта унія дазволіла падоўжыць існаваньне Вялікага Княства на некалькі стагодзьдзяў. Вынікам жа рэалізацыі гэтай новай формы дзяржаўнасьці стала негвалтоўная палянізацыя грамадзтва ВКЛ.

Польшча атрымала значныя тэрыторыі, што раней уваходзілі ў ВКЛ. Але «набыткам» стала таксама неспакойная мяжа з Расеяй. Празьмерна разрослыя тэрыторыі на паўднёвым усходзе абяцалі новыя сутычкі з Крымам і Атаманскай Портай. Наперадзе былі казацкія войны. На Польшчу ж прыпалі асноўныя ваенныя выдаткі фэдэратыўнай дзяржавы.

Для нас жа важнае тое, што Рэч Паспалітая была створаная паводле тагачасных праўных нормаў носьбітамі грамадзянскіх правоў, якія тады належалі шляхце. І як бы мы ні ацэньвалі далейшы лёс гэтай дзяржавы, якія б рахункі ні выстаўлялі да яе лідэраў і палітыкаў, як бы ні захапляліся культурнымі набыткамі і праявамі патрыятызму, мусім прызнаць: Рэч Паспалітая таксама была дзяржаваю нашых продкаў. У такім разе ўсе прэтэнзіі мы высоўваем і да саміх сябе.

## Што да тэрміну

Добра вядомы тэрмін Рэч Паспалітая зьяўляецца адпаведнікам лацінскага словазлучэньня res publica, што можна перакласьці як «грамадзкая / публічная справа». У польскім перакладзе тэрмінам Rzeczpospolita з канца XV ст. звыкла сталі пазначаць польскую дзяржаву, хоць мяркуецца, што традыцыя ўжываньня лацінскага тэрміну ў такім кантэксьце ідзе яшчэ з пачатку XIII ст. У XV—XVI ст. тэрмін Рэч Паспалітая выкарыстоўваўся і ў Вялікім Княстве Літоўскім, дзе ён меў значэньне дзяржавы як супольнай справы, супольных інтарэсаў і супольнага дабра. Жыгімонт Аўгуст у віленскім прывілеі 1565 г. так характарызаваў звароты да яго ад грамадзянаў ВКЛ: «Іж будзечы нам, гаспадару (г. зн. вялікаму князю. — А. Дз.) на вялікім сойме вальным у месьце нашым сталечным Віленскім... з усім рыцарствам земль усяго панства Вялікага Княства Літоўскага, дзе прыкладаючы патрэбы Рэчы Паспалітае таго панства нашага данесьлі просьбы свае...». Ужо пасьля Люблінскай уніі назва Рэч Паспалітая была выкарыстана для пазначэньня супольнай дзяржавы, але зусім не зьяўлялася яе афіцыйнымназовам, а тым больш палянізмам у беларускай мове, як некаторыя схільныя меркаваць. У расейскую мову словазлучэньне Рэч Паспалітая патрапіла менавіта зь беларускай.

Ці няма тут супярэчнасьці, што спадчынная манархія, якой у XV ст. яшчэ было ВКЛ, называецца Рэспублікай? І як разумець сумяшчэньне тытулаў караля ці вялікага князя з Рэспублікай? Ужо ў XVII ст. галяндзкі юрыст Гуга Гроцыюс пісаў, што ў Рэчы Паспалітай кароль атрымлівае ўладу пад пэўнымі ўмовамі і яго ўлада не зьяўляецца тым самым неабмежаванаю — гэтая «формула ўлады» ліквідуе Маестат (вялікасьць) караля, функцыі якога, у выніку, нагадваюць прэзыдэнцкія. Зноў узьнікае пытаньне: ці асацыяцыі рэспублікі толькі з выбарнасьцю яе цэнтральных органаў улады справядлівыя? Відавочна, што сучаснае разуменьне тэрміну рэспубліка нельга цалкам прыкладаць да эпохі XV—XVI стст.

## Рэспубліка — гэта Сувэрэнітэт

Тэарэтычную завершанасьць на пачатку Новага часу канцэпцыя «res publica» як дзяржава атрымала ў працах францускага юрыста XVI ст. Жана Бадэна (1530—1596; Jean Bodin, лацінізаваная форма Johanus Bodinius). Ён жа ўвёў у якасьці навуковага паняцьця і палітыка-прававога прынцыпу тэрмін «сувэрэнітэт», які застаўся зьнітаваны з паняцьцем рэспубліка. «Сувэрэнітэт ёсьць абсалютнай і вечнай уладай Рэспублікі», — так Ж. Бадэн акрэсьліў гэтую сувязь у сваёй працы «Шэсьць кніг пра Рэспубліку» («Six livres de la République»). Кніга ўбачыла сьвет у 1576 г. па-француску, а ў 1584 г. аўтар сам пераклаў яе на лаціну. Праца пра Рэспубліку стала галоўным творам Жана Бадэна і прынесла яму эўрапейскую славу. Аўтар пісаў, што сувэрэнная ўлада Рэспублікі распаўсюджваецца на ўсё грамадзтва і гэтым самым мае публічны характар, зьяўляецца спэцыфічнай прыкметаю дзяржавы. «…Варта бачыць у кожнай Рэспубліцы тых, хто трымае сувэрэнітэт, каб меркаваць пра тое, якая гэта дзяржава: у тым выпадку, калі сувэрэнітэт увасабляецца ў адным гаспадары, то мы назавем яе Манархіяй, калі да яго мае адносіны ўвесь народ, то мы скажам, што дзяржава зьяўляецца народнай; калі толькі меншая частка народу, мы будзем лічыць дзяржаву Арыстакратычнай». Дасьледчыкамі ўжо адзначалася, што словы «Манархія» і «Арыстакратычная» Ж. Бадэн пісаў зь вялікіх літараў, а «народная» — з малой. І гэта ёсьць сьведчаньнем праўнай пазыцыі праўніка. Увогуле Ж. Бадэн дапускаў, што Сувэрэнітэт можа ўвасабляцца ў кожнай з названых ім формаў кіраваньня. Але сам ён меркаваў, што пасьлядоўная і поўная рэалізацыя Сувэрэнітэту адбываецца толькі ў манархіі. Жан Бадэн — прыхільнік спадчыннай манархіі як найвышэйшай формы Рэспублікі. Між тым, ён крытычна ставіўся да абсалютнай манархіі і называў тры фактары, якія могуць абмежаваць уладу манарха:

1) калі манарх парушыць Боскія ці натуральныя законы;

2) калі падвысіць падаткі без атрыманьня згоды адпаведных упаўнаважаных інстытуцыяў дзяржавы;

3) калі адмовіцца ад выкананьня міжнародных пагадненьняў.

Ж. Бадэн адышоў ад разуменьня палітычнай улады ў інтэрпрэтацыі выключна праз рымскае права і сярэднявечную практыку. Францускі праўнік крытыкаваў таксама антычных аўтараў за тое, што яны вылучалі формы дзяржаўнага кіраваньня на грунце ідэі Справядлівасьці, у той час як трэба зыходзіць з ідэі і прынцыпу Сувэрэнітэту. Паводле Бадэна, Сувэрэнітэт зьяўляецца вытворным ад згоды народу (менавіта палітычнага народу) і ў той жа час сьцьвярджаецца прымусам.

Такім чынам, Рэспубліка ў Бадэна адпавядае паняцьцю Сувэрэнітэт, і калі той толькі ўвасабляецца ў дзяржаве, то Рэспубліка адпавядае Дзяржаве, пажадана — манархічнай. Не выпадкова таму ў ангельскіх выданьнях яшчэ XVII ст. Рэспубліку Бадэна перакладалі як «Commonwealth» — у сэнсе «супольнасьць», «дзяржава».

Сваім вучэньнем пра сувэрэнітэт Бадэн стварыў зладжаную публічнаправаўную канструкцыю новай эўрапейскай дзяржавы. Францускі праўнік вылучаўся рэалістычнай накіраванасьцю думкі, выхаванай старанным вывучэньнем «Палітыкі» Арыстотэля, да якой Бадэн напісаў падрабязныя камэнтары. Менавіта пад уплывам Арыстотэля ў Бадэна склалася ўсьведамленьне неабходнасьці параўнаўча-гістарычнага вывучэньня разнастайных формаў дзяржаўнага кіраваньня з мэтаю стварэньня агульнага палітычнага вучэньня.

## Экскурсавод па Парыжы для ліцьвінаў

Можна сьцьвярджаць, што досьвед і гістарычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага паўплывалі на фармаваньне канцэпцыі Жана Бадэна. На карысьць гэтага маюцца зьвесткі зь біяграфіі, а таксама выказваньні самога клясыка праўнай думкі. Сам Бадэн часта адыходзіў ад чыста акадэмічных і тэарэтычных заняткаў. Моцны тэмпэрамэнт і прыродныя схільнасьці так ці інакш прыводзілі яго на шлях служэньня грамадзтву.

Калі ў 1573 г. пасольства Рэчы Паспалітай накіроўвалася да Генрыха Валюа, герцага Анжуйскага, каб прапанаваць яму карону, то ў жніўні таго ж году ў Мэцы, непадалёку ад францускай мяжы, паслоў сустрэў і зачытаў ім прывітальную прамову біскуп Шарль дэ Кар. Пра палітычны народ (шляхту) Рэчы Паспалітай там было сказана, што ён «ніколі ня зносіў тыраніі ніводнага ўладара, што, бадай, адзіны сярод народаў утрымаў старадаўняе права выбару караля, якое існавала яшчэ ў «залатым веку». У атачэньне біскупа ўваходзіў і разам зь ім сустракаў паслоў Рэчы Паспалітай Жан Бадэн, які на наступны год апублікаваў тэкст прамовы па-француску. Францускія і польскія дасьледчыкі мяркуюць, што гэты тэкст для біскупа напісаў уласна Бадэн. І хоць выбарнасьць караля не была ідэалам Ж. Бадэна, але і вышэйпрыведзеная цытата адпавядае поглядам францускага праўніка на канцэпцыю Сувэрэнітэту як на паўнату ўлады і пераемнасьць права.

Ж. Бадэн суправаджаў паслоў Рэчы Паспалітай на шляху ў Парыж і знаёміў з гэтым горадам. Як мінімум, Бадэн выкарыстаў паслоў як крыніцу інфармацыі пра палітычны лад найбуйнейшай цэнтральнаэўрапейскай дзяржавы, пра што неаднаразова пісаў у сваёй працы «Рэспубліка». Таксама ён узгадваў імя Аляксандра Пронскага — прадстаўніка Вялікага Княства Літоўскага ў аб’яднаным пасольстве.

Князь Аляксандар Фрыдэрык Пронскі (каля 1550 — каля 1595), род якога паходзіў ад Рурыкавічаў, маладыя гады правёў пры двары францускага караля Карла IX, брата Генрыха Валюа. Што важна, ён вызнаваў кальвінізм і таму ўскосна быў уцягнуты ў барацьбу паміж каталікамі і гугенотамі ў Францыі, а таксама прэзэнтаваў пазыцыю пратэстантаў ВКЛ у перамовах з францускім каралеўскім домам. Нагадаем, што ўсяго толькі за год да прыезду пасольства Рэчы Паспалітай у Парыжы адбылася разьня пратэстантаў — Барталамееўская ноч (24 жніўня 1572 г.).

Імя Ж. Бадэна значылася ў сьпісе сьвіты будучага караля Генрыха ў Рэч Паспалітую, калі той у лютым 1574 г., выключна халоднай зімою, прыехаў у сваю новую краіну. Ужо потым, пасьля дэтранізацыі Генрыха Валюа, Бадэн настойваў на легітымнасьці прэтэнзіяў францускага караля Генрыха III на трон Рэчы Паспалітай. У любым выпадку, Бадэн атрымаў магчымасьць досыць блізка пазнаёміцца з праўнымі традыцыямі Рэчы Паспалітай, што паўплывала на распрацоўку яго канцэпцыяў. Усю сваю навуковую кар’еру Бадэн імкнуўся да сыстэматызацыі і ўпарадкаваньня: «...шматграннасьць ды неўпарадкаванасьць чалавечай дзейнасьці, шматлікія сьведчаньні гісторыі, у якіх дзеяньні і справы людзей завязаныя з пэўнымі заняткамі, уяўляюць зь сябе такі запас разнароднага матэрыялу, што гістарычныя працы ня могуць быць зразуметымі без выразнай сыстэмы, інакш іхны зьмест ненадоўга затрымаецца ў памяці».

Праца «Шэсьць кніг пра Рэспубліку» выйшла у сьвет праз два гады пасьля гісторыі з абраньнем на трон Рэчы Паспалітай і таемным ад’ездам адтуль 18—19 чэрвеня 1574 г. караля Генрыха.

## Эвалюцыя тэрміну

Для праўнікаў XVI ст. тэрмін рэспубліка меў маральна-праўныя аспэкты, а не сымбалізаваў прынцып выбарнасьці кіраўніка дзяржавы. У 1588 г. у Статуце ВКЛ гэтае разуменьне было акрэсьлена наступным чынам: «Абачывалі то ўсіх вякоў людзі мудрыя, жэ ў каждай Рэчы Паспалітай чалавеку пачсьціваму нічога ня мает быці дарожшага над вольнасьць».

Эвалюцыя тэрміну прывяла да таго, што менавіта аспэкт выбарнасьці цэнтральнай улады (як рэалізацыя прынцыпу Сувэрэнітэту) замацаваўся за паняцьцем Рэспубліка. Найбольш выразна такое разуменьне рэспублікі было сфармуляванае на пачатку XIX ст. «апосталам» аб’яднаньня Італіі Джузэпэ Мадзіні, які ў сваім вучэньні зыходзіў з чыста сьпірытуалістычных ідэяў. Бог зьяўляецца сьвету ў паступальным разьвіцьці і ўзвышэньні народаў. Выказьнікам Боскай волі зьяўляецца народ, а адзіная годная форма дзяржаўнага ладу — рэспубліка. Волевыяўленьне шляхам падачы галасоў — сьвяты абрад, у якім народ выконвае сваё прызначэньне. Ня нейкі адзіны чалавек, але ўвесь народ стане мэсіяй новага адкрыцьця.

На гэтым этапе тэрміналягічная трансфармацыя не спынілася. Сёньня мы маем прыклады многіх дзяржаваў, якія называюцца рэспублікамі, але зьяўляюцца звычайнымі дэспатыямі ці ваеннымі дыктатурамі. Іхныя ўладары кіруюць так, быццам яны перакананыя, што ніколі не памруць. Але наўрад ці яны здолеюць нас падмануць.

# Айцец Аляксандар Шрамко: царква стане больш



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аляксандар Шрамко**

нарадзіўся ў 1957 у Пінску. Украінец. Скончыў школу №3 г.Пінску з паглыбленым вывучэньнем фізыкі. Пасьля школы год працаваў электрыкам і майстрам па сыгналізацыях. У 1974—1980 вучыўся на факультэце радыёфізыкі БДУ. У канцы 1970-х прыйшоў да Бога, спачатку наведваў царкву Эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў «Галгофа». У гэты ж час кінуў працу па спэцыяльнасьці, працаваў дворнікам, разносіў газэты. Пасьля працаваў настаўнікам фізыкі, дапамагаў пры саборы Сьвятога Духу. У 1997 скончыў Менскую духоўную сэмінарыю. Сьвятарскае пасьвячэньне атрымаў у 1994, быў настаяцелем храму ў Строчыцах. Першы зь менскіх сьвятароў пачынае на службах чытаць Эвангельле па-беларуску. У 1995 — настаяцель храму ў Дружным. 1996 — клірык Сьвята-Пакроўскага прыходу (мікраraён Вясьнянка). 1997—2003 — выкладчык Сьвятога Пісьма ў Менскай духоўнай вучэльні. З 1999 стаў актыўным карыстальнікам інтэрнэту і стварае сайт «Дзёньнік сьвятара» (priestal.livejournal.com.). У 2004 становіцца адным з заснавальнікаў інтэрнэт-парталу «Царква».

У Беларусі вырасла новае пакаленьне праваслаўных сьвятароў — адкрытае сьвету і спагадлівае да беларускага адраджэньня. У пасьлявелікодны тыдзень госьцем онлайн-канфэрэнцыі «НН» стаў адзін з такіх. Клірык Сьвята-Пакроўскай царквы ў Менску Аляксандар Шрамко адказваў на пытаньні чытачоў сайту nn.by ў рэжыме рэальнага часу. Прапануем Вашай увазе некаторыя адказы.

## Кесару кесарава

**— «Кесару кесарава»: гэта як? Ці не занадта Праваслаўная царква «ўкесарылася»? Ці могуць у праваслаўнага хрысьціяніна быць палітычныя погляды, апазыцыйныя да ўлады погляды? Šept**

— «Кесару кесарава» — гэта не запавет Хрыста, а ягоны адказ на пытаньне, што мела на мэце злавіць Яго на слове. З гэтага выводзіць нейкую багаслоўскую канцэпцыю няправільна.

Наконт адносінаў царквы і дзяржавы. Тут ёсьць пэўныя перакосы, нават трагічныя перакосы. Але царква мае магчымасьці, каб выйсьці на правільны шлях у стасунках зь дзяржавай.

Ісус Хрыстос прыйшоў у сьвет прапаведаваць Царства Божае. Такім чынам Ён супрацьпаставіў сябе таму царству, у якім ён жыў. Фактычна Ён паказаў людзям альтэрнатыву існаму парадку, а таму, у нейкім сэнсе, быў апазыцыянэрам. Але апазыцыянэрам па вэртыкалі, а не гарызанталі. Ягонае царства падымаецца над плоскай зямной рэчаіснасьцю.

Няма ніякіх часткаў жыцьця, якія б ня тычыліся веры. Заўсёды чалавек мусіць дзейнічаць па праўдзе Божай, а не па страсьці, пошуку карысьці, прагі да ўлады, нянавісьці, фанатычным сьледаваньні нейкай ідэалёгіі ці лідэру.

**— Як Вы ставіцеся да пажаданьняў уладыкі Філарэта прэзыдэнту Лукашэнку падчас інаўгурацыі 8 красавіка 2006 г., дзе ён пакарыстаўся кампіляванай цытатай з 2-й главы 1-й Кнігі Царстваў, тым самым выкарыстаўшы старазапаветны прынцып «вока за вока, зуб за зуб». Адпаведнае месца, дзе гаворыцца пра абарону «нашых гарадоў і нашага Бога», заканчваецца ў Старым запавеце пажаданьнем Саўла свайму сыну Давыду, каб ён «зьвёў пекла сваіх ворагаў па калена ў крыві». Ці па-хрысьціянску паступае Ўладыка? Фрыдрых Кіпа**

Ісус Хрыстос быў апазыцыянерам.

— Я думаю, што гэта даволі вольная інтэрпрэтацыя слоў. Пажаданьне мітрапаліта Філарэта — гэта звычайная справа, калі галава галоўнай канфэсіі выказвае пратакольную падтрымку прэзыдэнту. Калі б да ўлады прыйшоў Зянон Пазьняк, у мітрапаліта Філарэта знайшліся б добрыя словы і для яго.

**— Ці лічыце Вы, што кожная ўлада ад Бога? Ці толькі тая, якая выконвае Боскія запаветы? Siabruk**

— Кожная ўлада ў нейкім сэнсе ад Бога, як здароўе, напрыклад.

## Нацыянальны рух і царква

**— Ці Вы бачыце супярэчнасьці ці канфлікты паміж сучасным беларускім на-**

# «Калі ўвесьці аўтакефалію, залежнай ад дзяржавы»

**цыянальным рухам і Праваслаўнай царквой? Паміж Праваслаўнай царквой і Каталіцкім касьцёлам у Беларусі? Што б Вы адказалі тым, хто кажа, што БПЦ (МП) — «рука Масквы, якая праводзіць антынацыянальную палітыку»? Алесь**

— Паміж Царквой і Касьцёлам супярэчнасьці былі, ёсьць і будуць. Яны маюць розныя разуменьні веры, шляхоў Царквы. Што датычыць супярэчнасьцяў паміж нацыянальным рухам і Царквой — яны ёсьць і таксама будуць. Бо паміж Царквой і сьветам заўсёды існуюць супярэчнасьці. Але іх можна зьняць, бо яны ёсьць вынікам непаразуменьняў і перадузятасьці. Нацыянальны рух большай часткай сваёй настроены супраць Расейскай Праваслаўнай Царквы, лічыць яе ворагам нацыянальнага адраджэньня. Таму і Праваслаўная царква глядзіць асьцярожна на тое, што нацыянальны рух можа ўзяць уладу. І ці ня будуць ганеньні на Царкву? Калі б беларускі нацыянальны рух з большай павагай ставіўся да Царквы, то лепш было б усім. Праваслаўная царква ў сваім вучэньні ня мае нічога такога, што прынцыпова перашкаджала б ёй супрацоўнічаць з нацыянальным рухам.

Наконт «рукі Масквы» — гэта пазыцыя XIX ст., цяпер ніякай антынацыянальнай накіраванасьці царква ня мае.

**— Хрыстос уваскрос! Ойча, ці мітрапаліт Філарэт увогуле ведае беларускую мову? Siabruk**

— Уладыка Філарэт нявельмі добра валодае беларускай мовай, бо ён паводле паходжаньня расейскі чалавек, але ня думаю, што ён больш супраць беларускай мовы, як шмат якія беларусы, як вядомыя нам дзяржаўныя кіраўнікі, якія ня могуць размаўляць ні на той, ні на той мове. Уладыка ня супраць, калі зь ім размаўляюць па-беларуску, чытае лісты па-беларуску.

**— Хто адродзіць беларускае праваслаўе? Павучок**

— Трэба адраджаць ня так праваслаўе, як хрысьціянства. Праваслаўе ня можа быць беларускім, расейскім ці яшчэ якім. Яно — сусьветнае. І нават у праваслаўі трэба адраджаць тую частку, якую называюць хрысьціянствам, якая складае сутнасьць веры, а не набор нейкіх традыцый, што часта ня маюць да веры ніякага дачыненьня.

> Верыць у цуды — замена сапраўднай веры, веры ў Бога.

**— Ці Праваслаўная царква лічыць законнымі рашэньні Полацкага сабору 1839 г. аб скасаваньні ўніі з Рымам? Ці ёсьць падставы сьцьвярджаць, што тыя рашэньні прымаліся бязь ціску акупацыйнай улады і былі свабодным выражэньнем волі ўніяцкага духавенства? Ігар**

— Шмат чаго ў царкоўнай гісторыі стваралася не зусім карэктна. Калі казаць пра сабор 1839 г., трэба казаць пра Сабор, які гэту унію ўвёў, калі быў ціск каталіцкіх уладаў.

Але мы павінныя патрабаваць, каб вернікам-уніятам была дадзеная магчымасьць весьці сваё царкоўнае жыцьцё і магчымасьць мець храмы. Можа, мала хто ведае, але Праваслаўная царква дапамагала Каталіцкай царкве атрымліваць тыя храмы, што існуюць цяпер у Менску.

Я лічу, што ў нас павінна быць хрысьціянская салідарнасьць. Гэта датычыць і касьцёла Сьвятога Язэпа і царквы «Новае жыцьцё».

**— У якую царкву ў Менску падацца беларускамоўнаму праваслаўнаму хрысьціяніну? Уладзімер Русаковіч**

— Можна знайсьці групоўкі людзей у розных храмах. Можаце зьвярнуцца да мяне асабіста, у храм у Вясьнянцы, які сёньня асьвячаўся. Духоўныя справы павінныя быць ня модай, а ўнутранай патрэбай чалавека. Трэба, каб царква была ня месцам, дзе чалавек аддае даніну нейкай рэлігійнасьці, а дзе ён знаходзіць веру ў Бога.

## Аўтакефалія

**— Ці падрыхтаваная сёньня, на Ваш погляд, БПЦ да аўтакефаліі? Дзед; Якія мінусы ў аўтакефаліі? рут**

— Калі ўвесьці аўтакефалію ў Беларусі, царква стане больш залежнай ад дзяржавы. Тое, што яна не аўтакефальная, гэта гарантыя нейкай незалежнасьці, таго, што царква ня стане нейкім карманным прыдаткам.

Гэта ўсё патрэба часу, а не каштоўнасьць, якую трэба ставіць за мэту. Пакуль лепш захоўваць статус-кво. Няма ніякіх прычын ламаць усё, пачынаць унутраную вайну, каб здабыць аўтакефалію, якая чалавека не выратоўвае. Але пра гэта трэба разважаць. І цяпер трэба, каб слова «аўтакефалія» не выклікала насьцярожанасьці.

**— Ці магчымае ў Беларусі зьяўленьне прыходаў, падпарадкаваных канстантынопальскаму Патрыярхату? artur**

— Можа, і магчыма, але будзе не кананічна. Тое, што зрабілася ў Эстоніі, гэта не зусім правільна.

## Цуды і місіі

**— Што Вы думаеце пра цуд дабрадатнага агню? Што для Вас вера? Ёпс**

— Трэба спакайней ставіцца да ўсякіх цудаў, у тым ліку і да цуду дабрадатнага агню. Я ня маю цьвёрдых доказаў, што дабрадатны агонь — гэта цуд, але і верыць у яго лічу заменай сапраўднай веры, веры ў Бога. Такую веру ў цуд асуджаў яшчэ Ісус Хрыстос. Наданьне гэткай увагі такой зьяве (верыць ці ня верыць) ёсьць адводам ад сапраўднай веры. Ёсьць меркаваньне Сматрыцкага і іншых багасловаў, што гэта ня цуд. У маім жыцьці гэта займае мала месца.

Вера — гэта адкрыцьцё нейкіх ісьцін чалавеку ад Бога, да якіх бы ён сам ніколі не дайшоў сваім розумам, а таксама вера — гэта давер да Бога.

**— Парайце, калі ласка, як даказаць атэісту існаваньне Бога. Міністрант**

— Сам Бог не імкнецца даказваць атэісту сваё існаваньне, значыць, у гэтым ёсьць нейкі сэнс. Магчыма, сутнасьць у тым, каб вера прачнулася ўнутры, у сэрцы, а не была даказаная.

**— Ці Вы лічыце фільм «Востраў» найлепшым праваслаўным мастацкім фільмам? Аляксандар**

— Сама фармулёўка «праваслаўны мастацкі фільм» мне бачыцца абсурднай. Калі пра сам фільм «Востраў», дык

Працяг на старонцы 24.

# Айцец Аляксандар Шрамко: «Калі ўвесьці аўтакефалію, царква стане больш залежнай ад дзяржавы»

**Працяг са старонкі 23.**

я стаўлюся з насьцярожанасьцю.

**— Чаму ў Беларусі няма праваслаўных місіянэраў, як дыякан Кураеў у Расеі? Аляксандар**

— Дыякан Кураеў папулярны, але ў царкоўным асяродку. А місіянэр працуе ж не на царкоўную аўдыторыю. Лепш было спытаць так: чаму ў сьвеце сёньня няма такіх місіянэраў, як апостал Павал.

## Саборная сьвядомасьць

**— Як Вы ставіцеся да дазволу неабарцыйных сродкаў кантрацэпцыі ў Сацыяльнай канцэпцыі РПЦ? d_w**

— Я не лічу гэта важным пытаньнем у справе веры. Бываюць розныя мэдычныя сытуацыі, калі няма забойства наўпрост, якім ёсьць аборт, і тут трэба глядзець у кожнай канкрэтнай сытуацыі.

**— Чаму праваслаўныя ярархі не выступаюць у падтрымку грэка- і рымакаталікоў у іх барацьбе за манастыр бэрнардынаў і касьцёл Сьв.Язэпа? Чалавек**

— Гэта пытаньне, якое датычыць адносінаў царквы і дзяржавы. Самі каталіцкія ярархі баяцца заявіць пра свае патрабаваньні. Нядаўна быў выпадак, калі біскуп Антоні Дзям'янка праз рассылку афіцыйнага сайту выказаў такое патрабаваньне, а потым сам яго і скасаваў. Чаму праваслаўныя ярархі тады мусяць быць больш сьмелыя за каталіцкія?

**— Айцец Аляксандар, уявіце на хвіліну, што Вы займаеце пасаду Ўладыкі Філарэта. Ці зьмянілі б што-небудзь ? Чалавек**

— Царква — гэта супольнасьць людзей, а не каманда, якой кіруе япіскап. Адзін чалавек мала што можа зрабіць у Царкве. Каб нешта зьмянілася, трэба саборная сьвядомасьць.

**— Ці не здаецца Вам, што ў Праваслаўнай царкве замала ўвагі надаецца катэхізацыі дзяцей і дарослых? Siabruk**

— Катэхізацыя — адна з самых балючых праблем Царквы. Гэта першае, з чаго трэба пачынаць зьмены ў Царкве. Калі б я быў япіскапам, то менавіта з гэтага пачынаў бы.

## Уладыка не забараняў...

**—Як Вы бачыце жыцьцё беларуса-хрысьціяніна ў сеціве? Rat King**

— Інтэрнэт — вялікая магчымасьць для хрысьціяніна. Ня трэба блытаць нацыянальную сьвядомасьць зь местачковасьцю. Трэба шукаць людзей усюды, дзе яны ёсьць. Дзе яны ёсьць, ёсьць і дабро, і Бог.

**— Летась уладыка Філарэт забараніў Вам весьці ў інтэрнэце livejournal, але Вы працягваеце яго весьці. Чаму не прыслухаліся да парадаў/указаў мітрапаліта? Мароз**

— Уладыка Філарэт не забараняў мне весьці livejournal, ён ня ведае такога слова нават. Гэта дадумана СМІ. Гаворка ішла пра забарону маёй публіцыстычнай дзейнасьці без блаславеньня царкоўнай улады. Але мяне запрашаюць на канфэрэнцыю, прысьвечаную інтэрнэту, уключылі ў каардынацыйную раду, прысьвечаную праваслаўным ўэб-рэсурсам. Пакуль пытаньне ня вырашана канчаткова, але будзе знойдзены кампраміс.

**— Ці спрачаюцца ў Вас часам фізык і сьвятар? матэматык**

— Не спрачаюцца. Я прыйшоў да веры шмат у чым дзякуючы таму, што быў фізыкам. І бачыў у фізычных зьявах вобразы духоўнага жыцьця і нават дагматычных ісьцін. Сярод сьвятароў шмат людзей з тэхнічнай адукацыяй.

**— Якой грамадзкай дзейнасьцю Вы актыўна займаецеся (як запісана ў біяграфіі)? Алег**

— Займаўся ў былым. Браў удзел у дзейнасьці «Украінскай хэльсынскай суполкі» (першая ўкраінская дысыдэнцкая арганізацыя ў савецкія часы. — **Рэд.**). Цяпер грамадзкая дзейнасьць — гэта частка маёй сьвятарскай дзейнасьці.

**— Чаму Вы, украінец, за беларушчыну? Siabruk**

— Чаму б украінцу ня быць за беларушчыну? Быў бы ў Літве, падтрымліваў бы літоўшчыну.

* * *

Паважаныя сябры, Хрыстос Уваскрос. Будзем памятаць больш пра Хрыста і вакол Яго больш аб'ядноўвацца. Каб сказаць, што ня я жыву, а ўва мне жыве Хрыстос. І праз Хрыста мы знойдзем разуменьне ва ўсіх нашых пытаньнях. Прыходзьце ў наш храм, зазірайце на наш сайт «Царква» www.churchby.info, ці acq 199480185, ці праз скайп — priestal, ці праз электронны дзёньнік — priestal.livejournal.com.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Раманаў, Е.Р. З гісторыка-археалагічнай спадчыны: Выбраныя творы / Падрыхтоўка да публікацыі, уступны тэкст і навуковае рэдагаваньне І.А.Марзалюк.** — Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. — 240 с.

У зборніку публікуецца шэраг каштоўных пісьмовых крыніцаў і нататак па гісторыі Магілёўшчыны. Публікацыя выбраных твораў «Радзіміча», як падпісваўся Еўдакім Раманаў, выйшла ў 150-ю гадавіну з дня народзінаў няўрымслівага гісторыка і краязнаўцы. Але ёсьць адна рыса гэтага дасьледчыка, якая малавядомая сучасным чытачам — Е.Раманаў быў прыхільнікам арганічнай працы. Калі ў 1912 г. сябры новазаснаванага ў санкт-пецярбурскім унівэрсытэце беларускага навукова-літаратурнага гуртка зьвярнуліся да патрыярха па парады ў вывучэньні Беларусі, то той адказаў: «...Працуйце і ў эканамічнай галіне. Ратуючы народ ад эканамічнай залежнасьці, ад ягоных ворагаў, вы ратуеце яго ад духоўнага паняволеньня. Кіруйцеся прыкладам польскіх масаў Прывісьленскага краю, ладзьце каапэратывы, склады, таварыствы і г.д. ды ўстановы дробнага крэдыту. Але ж вось, у забітага, загнанага народу няма ініцыятывы. Ваш просты абавязак — зрабіцца тут ініцыятарамі...»

**Лысенко, П.Ф. Сказание о Турове.** — Менск: Беларуская навука, 2006. — 118 с.: іл.

Пётар Лысенка немалую частку свайго жыцьця прысьвяціў дасьледаваньню аднаго з самых старажытных гарадоў Беларусі — Турава. Маючы паходжаньне з Полаччыны, свае сымпатыі археоляг аддае Палесьсю, як ён сам гаворыць, краю Беларускай Амазонкі — Прыпяці. Новая кніжка П.Лысенкі ўтрымлівае зьвесткі пра сэнсацыйныя вынікі раскопак апошніх гадоў: знаходку паганскага капішча — адзінага, знойдзенага на гарадзішчах старажытных беларускіх гарадоў; знаходку падмурку незразумелага цаглянага збудаваньня ў форме крыжа, выяўленага падчас пошуку рэштаў вежы-данжона; раскрыцьцё падмуркаў храма XII ст. Першая рэакцыя — для апісаньня падобных аб'ектаў абраны занадта аблегчаны, навукова-папулярны жанр. Але зразумела, што апрацоўка выяўленага матэрыялу патрабуе добрага часу. Таму будзем чакаць публікацыі падрабязных вынікаў дасьледаваньняў.

**Алег Дзярновіч**

# Пачынаецца чэмпіянат сьвету па хакеі

Зборная Беларусі па хакеі рыхтуецца да пачатку чэмпіянату сьвету ў Маскве і Мыцішчах. У аўторак яна правяла апошні таварыскі матч. Супернікам была моцная славацкая каманда. Як і на леташнім чэмпіянаце сьвету, беларусы перамаглі зь лікам 2:1.

Перад пачаткам чэмпіянату зборная Беларусі правяла шэсьць таварыскіх сустрэч: з славенцамі, славакамі і двойчы — з італьянцамі і нарвэжцамі. Абсалютна ва ўсіх гульнях нашы хлопцы атрымалі перамогі.

Зборную Беларусі летась узначаліў новы галоўны трэнэр, канадца Глена Хэнлана зьмяніў амэрыканец Курт Фрэйзэр. Гэта будзе ягоны дэбютны чэмпіянат. Летась беларусы ў Рызе былі шостымі. Сёлета плянуюць выступіць яшчэ лепш. Фрэйзэр жа адкрыта заяўляе, што каманда едзе змагацца за мэдалі.

Чэмпіянат пачнецца ў пятніцу 27 красавіка. І ўжо ў першы дзень наша каманда пазмагаецца з Чэхіяй. У нядзелю — гульня з ЗША. Скончыцца групавы турнір для беларусаў матчам з аўстрыйцамі. У другі этап пройдуць па тры найлепшыя каманды з кожнай групы. Зборная Беларусі свае матчы будзе праводзіць не ў расейскай сталіцы, а ў падмаскоўных Мыцішчах.

Матчы будуць трансьлявацць тэлеканалы БТ і «Лад».

**Зьміцер Панкавец**



КАМСАМОЛЬСКАЯ ПРАЎДА Ў БЕЛАРУСІ

**Дзьмітры Лукашэнка, старшыня «Прэзыдэнцкага спартовага клюбу», стаў пераможцам турніру НХЛ: «Начной хакейнай лігі». Гэта чэмпіянат сталіцы па хакеі сярод аматарскіх камандаў, дзе перамагла каманда «Рубеж». За яе іграюць Віктар і Дзьмітры Лукашэнкі. У «НХЛ» гуляюць «занятыя ўдзень дарослыя людзі». Напрыклад, дырэктар комплексу «Раўбічы», гендырэктар хакейнага клюбу «Дынама», начальнік райаддзелу падатковай інспэкцыі, супрацоўнікі ГУВД і пракуратуры.**

## Беларусы везьлі ўран

У Літве за спробу кантрабанды радыёактыўнага грузу зьмешчаныя пад варту два грамадзяніны Беларусі. Парушальнікаў затрымалі 22 красавіка на беларуска-літоўскай мяжы. У таемніку ў багажніку яны везьлі мэталічны кантэйнэр з надпісам «Уран-238, 1991». Вядзецца сьледзтва.

## Прыехаў унук Дастаеўскага

У вёску Дастоева Янаўскага раёну прыехаў праўнук Фёдара Дастаеўскага — Дзьмітры, які жыве ў Пецярбургу. Гэта першы візыт прадстаўніка роду Дастаеўскіх на радзіму продкаў.

## Рынак у Варшаве дажывае

Варшаўскія ўлады вызначылі тэрмін закрыцьця стадыёну Дзесяцігодзьдзя — аднаго з самых вялікіх базараў Эўропы. На стадыён па тавары прыяжджалі і прыяжджаюць тысячы замежнікаў — у тым ліку і беларусаў. На яго месцы плянуюць збудаваць вялізны сучасны Нацыянальны стадыён, на якім наладзяць адкрыцьцё футбольнага чэмпіянату Эўропы ў 2012 г.

Гандлярам прапанавалі сем іншых месцаў, куды можна перанесьці свае яткі.

## Над галавой Навумава зьбіраюцца хмары

У Адміністрацыі прэзыдэнта прайшла нарада з удзелам А.Лукашэнкі. Пастанавілі, што ўдзел нашай каманды ў чэмпіянаце іншай краіны немэтазгодны — высілкі вырашана скіраваць на разьвіцьцё нацыянальнага першынства. Кіраўнік хакейнай фэдэрацыі Ўладзімер Навумаў, адзін з ініцыятараў праекту ўдзелу беларускага клюбу ў чэмпіянаце Расеі, пакіне куратарства хакейным клюбам «Дынама». Цяпер чэмпіён Беларусі будзе пад апекай Юр'я Бародзіча — былога кіраўніка службы аховы Лукашэнкі.

## Турцыя: сьмерць за публікацыю Біблії

Тры працаўнікі выдавецтва *Zirve*, якое публікуе Біблію, — былі забітыя у горадзе Малацця 18 красавіка. Ахвярам перарэзалі горла. Яшчэ два супрацоўнікі друкарні ў шпіталі ў цяжкім стане. Ахвярам пагражалі ў сувязі з публікацыяй хрысьціянскай літаратуры. Выдавецтва належыць пратэстанцкай Царкве. Паліцыя арыштавала дзесяць падазраваных. Асноўная вэрсія: злачынства было матывавана рэлігійным фундамэнталізмам. Малацця лічыцца калыскаю турэцкага ісламізму. У яго прыгарадзе нарадзіўся Алі Агджа, які ў 1981 г. спрабаваў забіць Яна Паўла ІІ.

## .eu — трэці па папулярнасьці дамэн у Эўропе

У красавіку эўрапейскаму інтэрнэт-дамэну .eu спаўняецца год. За гэты час у яго рамках было створана 2,5 млн. сайтаў. Новы дамэн — трэці па папулярнасьці ў Эўропе і сёмы — на плянэце. Любое прадпрыемства альбо інстытут, разьмешчаныя ў Эўрапейскім Саюзе, а таксама любы грамадзянін дзяржавы ЭС могуць стварыць ўэб-старонку на агульнаэўрапейскім дамэне. Найбольш заявак на атрыманьне адрасу ў рамках дамэну .eu паступіла ад кампаніяў і грамадзянаў ФРГ (31%), Вялікабрытаніі (17%) і Нідэрляндаў (12%).

**МБ; АГ**

# Траска і Мянтуз



Пра самую важную рыбу ў гісторыі чалавецтва піша Алесь Белы.

Традыцыйная беларуская кухня небагатая на стравы з марской рыбы; аддаленасьць ад мора, слабы ўдзел у міжнародным гандлі і архаічная структура гаспадаркі стагодзьдзямі не спрыялі. У сучаснай Беларусі выбар марской рыбы бедны ў параўнаньні з суседнімі краінамі, а цэны вышэйшыя, праз манапалізацыю імпарту некалькімі прывілеяванымі фірмамі. Сытуацыя ў нечым паўтарае часы прыгону, калі манапалістамі выступала ня вузкая група камэрцыйных кампаній, а прывілеяванае саслоўе — шляхта.

З канца XV ст. лоўля траскі у паўночнай Атлянтыцы, асабліва на водмелях Ньюфаўндлэнду, зрабілася буйным промыслам, за які спаборнічалі баскі, нарвэжцы, датчане. Паступова першынство захапілі дзяржавы з магутным ваенным флётам — Галяндыя, Францыя, Ангельшчына, якія гвалтам выцісьнілі «маргіналаў» з зонаў промыслу. У XVI—XX ст. траска была першай або другой па распаўсюджанасьці марской рыбай у рацыёне Заходняй Эўропы, даступнай нават найбяднейшым пластам грамадзтва. У англасаксонскіх народаў промысел траскі і стравы зь яе — істотная частка традыцыйнай культуры.

Некаторыя гісторыкі культуры называюць траску «самай важнай рыбай у гісторыі чалавецтва», улічваючы агульны аб’ём улову за апошнія 500 гадоў, — а траска ж гэта не селядзец! Даўжыня да 180 см, вага да 40 кг. Улічым таксама ролю, якую адыгралі ў сусьветнай гісторыі народы, якія елі траску ўвесь гэты мадэрны час. Ці не яна падтрымала сваім ёдам ды мікраэлемэнтамі іх інтэлектуальны і тэхналягічны рывок?

Траску трыбушылі і салілі на борце карабля ў Паўночнай Атлянтыцы (тады яна высыхала да ўтрыманьня вільгаці ў 40%) і называлі бакалао; або сушылі ў эўрапейскіх портах да ўсяго 15% вільгаці — такую траску называлі штокфіш, ці то таму, што яна была цьвёрдай і сухой як палка, ці то таму, што яе ў літаральным сэнсе лупцавалі палкай перад прыгатаваньнем, каб крыху зьмякчыць. Прыкладна да такога стану беларусы даўней высушвалі тварожны сыр. На сушанай трасцы, калі памятаеце, ляпляндка выразала Гердзе «рэкамэндацыйны ліст» да суседкі-фінкі ў «Сьнежнай каралеве» Андэрсэна.

У асноўным траска была даступнай ў Рэчы Паспалітай, праз гданьскі гандаль, менавіта ў выглядзе такога штокфішу. «Літоўская гаспадыня» нават прапануе адбіваць яе молатам на кавадле, а потым замочваць на ноч у рачной вадзе. Іншая рэкамэндацыя той жа кнігі — пасьлядоўна вымочваць спачатку ў альховым ці бярозавым шчолаку 4 дні, затым разразаць на кавалкі і яшчэ раз вымочваць у шчолаку 4 дні, затым паласкаць у халоднай вадзе і заліваць на некалькі дзён вапнавай вадой, і нарэшце яшчэ сама меней 3 дні вымочваць у звычайнай вадзе, мяняючы яе 3 разы на дзень, але «можна мачыць і далей, гэта рыбе не шкодзіць». Зразумела, ніякая сялянская або дробнашляхецкая гаспадарка не магла сабе дазволіць такую двухтыднёвую прыгоду, ня кажучы ўжо пра больш чым сумнеўны смак далікатэсу, які чакаў у канцы. Сродкаў транспарціроўкі сьвежай рыбы да нядаўняга часу не існавала, як і маразільнай тэхнікі. Таму смак траскі, вядомы нашым продкам, быў значна бяднейшым, чым той, які мы можам адчуваць сёньня. У «Літоўскай гаспадыні» зьмяшчаецца шэраг рэкамэндацый, як імітаваць траску зь мясцовых прэснаводных рыб — шчупака і судака. Канечне, калі іх як след высушыць, а потым пасьлядоўна правесьці праз усе маніпуляцыі са шчолакам, вапнай і вадой, дык на смак амаль ня будзе розьніцы, як шчыра прызнаецца руплівая шляхецкая гаспадыня.

Траска — каштоўная рыба з добрымі дыетычнымі вартасьцямі (малы зьмест насычаных тлушчовых кіслотаў ды нізкая калярыйнасьць — 118 ккал на 100 г), з лагодным смакам, далікатным белым, сочным, слаістым мясам. Траска арганічна спалучаецца з большасьцю прыправаў ды надаецца да гатаваньня рознымі спосабамі: смажаньня, запяканьня, вырабу кракетаў, мусаў, катлетаў, заліўнога. Падаюць і гарачай, і халоднай, з разнастайнымі соўсамі. Перад гатаваньнем рэкамэндуецца на працягу гадзіны ці болей вымачыць у лімонным соку, каб выдаліць непрыемны смак і пах рыбінага тлушчу. Клясычным беларускім спосабам гатаваньня лічыцца тушэньне або запяканьне пад «футрам» з пакрышаных кіслых яблыкаў (морквы, хрэну), цыбулі і сьмятаны.

Польская назва траскі — dorsz — запазычаньне зь нямецкай мовы; палякі бадай так і ня здолелі палюбіць траску. Калі ў часы ПНР гэтая рыба была асноўнай у мэню сацыялістычнага паляка, склалася іранічнае прыслоўе: «Еж доршы — гувно горша».

Старабеларускія крыніцы зь сярэдзіны XVI ст. і да наступленьня эры татальнай дамінацыі пальшчызны, называлі траску на літоўскі капыл «мянка» (ад літ. ménkė), відавочна, праз асацыяцыі зь яе сваяком менем (ментузом). А вось расейскае «траска» (і беларуская калька зь яго) паходзіць ад старанарвэскага thorskr («штосьці, што належыць сушыць», або «сушаніна») — яшчэ адно сьведчаньне пра самы распаўсюджаны калісьці спосаб нарыхтоўкі траскі ў запас. Гэтае слова ў расейскай мове пашырылася некалькі стагодзьдзяў таму, дзякуючы суседзтву памораў з нарвэжцамі на поўначы. Трэба думаць, так называў гэтую рыбу і заснавальнік беларускай дзяржавы, вікінг Рагнвальд-Рагвалод, так што слова гэтае нам не зусім чужое; цікава,

што ірляндцы і шатляндцы, якія знаходзіліся пад уплывам вікінгаў у тыя ж часы, што і мы, называюць траску trosc і trosg, адпаведна.

Каб атрымаць уяўленьне аб смаку траскі, беларусам не абавязкова было яе фальсыфікаваць, бо даўней значна часьцей сустракаўся ў нас мянтуз — адзіная праснаводная рыба сямейства трасковых, якая жыве і ў плыткіх прыбярэжных водах Балтыкі, адкуль і расьсялілася ў рэкі і азёры. У Беларусі ды Літве мянтуз жыве ў вадаёмах з халоднай чыстай вадой і камяністым дном, у ямах, пад берагамі. Прамысловае значэньне мае ў Браслаўскіх і Нарачанскіх азёрах, той частцы Беларусі, дзе скандынаўскія леднікі пакінулі па сабе найбольш відавочныя знакі.

Мяса ментуза белае, шчыльнае, бяз дробных костак, смачнае ды дыетычнае (19% бялку, 0,6% тлушчу). Далікатэсам, як і ў траскі, лічыцца вялікая тлустая пячонка (51—67% тлушчу, багатага на вітаміны A і D), у некаторых краінах яе ядуць сырой. У расейскай кухні цэняцца юшка зь ментуза, смажаны, заліўны мянтуз, пірагі з начынкай зь ментуза. Увогуле, яго можна гатаваць гэтаксама, як і траску. Мянтуз асабліва папулярны ў фінскай нацыянальнай кухні, дзе шмат азёраў з патрэбнымі гэтай рыбе ўмовамі; далікатэсам лічыцца ў фінаў і ікра ментуза. Відаць, даўней ня грэбавалі ёй і беларусы. Адна з народных прыкметаў вызначала па ёй пачатак будучай вясны: «Калі да Піліпавых заговін (пачатак Каляднага, або Піліпаўскага, посту ў праваслаўных — 15 лістапада) мянтуз намеча ікру — зіма адыдзе раней; адваротнае здарыцца, калі мянтуз меча ікру пазьней, перад днём восеньскага Юр'я».

Магчыма, калісьці мы ўсталюем дзень памяці Рагвалода або дзень памяці Торвальда, апостала Ісьляндыі і Беларусі, і будзем ушаноўваць іх стравамі з траскі, прыгатаванымі паводле традыцыйных беларускіх рэцэптаў, і давядзем тым усяму свету, што наша памяць лепшая, чым у траскі, амаль як у тых народаў, што многія стагодзьдзі яе спажывалі.



**Мянтуз**

прышэлец з больш халодных марскіх водаў, актыўны ўвосень і зімой, а летам упадае ў сьпячку. Даўжыня цела да 1,7 м, маса да 32 кг (у Беларусі такія буйныя не сустракаюцца, максімум да 5 кг). Цела падоўжанае, акруглае, звужанае да хваста, ўкрытае вельмі дробнай луской. Сьпіна зеленаватая або аліўкава–зялёная (як і ў траскі) з чорна–бурымі плямамі і палосамі (у адрозьненьне ад дробных жаўтаватых плямаў на сьпіне траскі). Галава шырокая ды прыплюснутая. Верхняя сківаца выступае ўперад. На ніжняй сківіцы 1 вусік, 2 вусіка – ля наздрэй. Шматлікія шчацінкападобныя зубы выдаюць драпежніка.

### Траска, тушаная зь яблыкамі

*600 г рыбы, 5 яблык, 1 цыбуля, 1 стакан сьмятаны, перац, соль.*

Траску нарэзаць кавалкамі, а ачышчаныя ад скуры і сарцавіны яблыкі — скрылькамі. Нашаткаваць цыбулю. На глыбокую бляху, нашмараваную тлушчам, скласьці пластамі прадукты, заліць невялікай колькасьцю рыбнага булёну або вады і тушыць да разьмякчэньня костак рыбы. Затым рыбу перакласьці на талерку, а яблыкі і цыбулю працерці, дадаць соль, перац, сьмятану і давесьці да кіпеньня. Пры падачы на стол рыбу паліць атрыманым соўсам.

### Посная юшка зь ментуза (з «Кухаркі літоўскай» В. Завадзкай)

*1200 г ментузоў, 2–3 «бабкі» (лаўровыя лісты), 5–10 каліў «ангельскага зельля» (духмянага перцу), 1 сярэдняя галоўка кветкавай капусты, 1 корань пятрушкі, 1 корань «салеры» (сельдэрэя), 1–2 цыбулі, 2 морквы, ½ шклянкі варанай кашы (напр., рысу або панцаку), 1 лыжачка масла, 1 галінка зялёнай пятрушкі*

Ментузоў абдаць кіпнем, сьцягнуць скуру і пасаліць, пакінуць на пэўны час. Зварыць булён зь пятрушкі, салеры і цыбулі, незадоўга да пачатку кіпеньня ўкінуць перац і бабкі, даць закіпець, працадзіць. Парэзаць ментузоў на кавалкі разам з трыбухой і варыць у адвары з карэньняў, дадаўшы пакрышаную моркву і кветкавую капусту. Зьняць пену, дадаць масла і пакрышаную зеляніну, а таксама загадзя звараную кашу.

## НОВЫЯ КНІГІ

**Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / Аўт.-склад. А.М.Булыка.** — Мн.: ТАА «Харвест», 2005. — 336 с.

Адметнасьць слоўніка — наяўнасьць у ім менавіта актуальнай лексыкі, якая ўвайшла ў беларускую мову на працягу апошніх дзьвюх дзесяцігодзьдзяў. Аснову слоўніка складаюць новыя лексычныя адзінкі, запазычаныя ў сувязі са зьменамі ў грамадзка–палітычнай, эканамічнай, культурнай і іншых сфэрах жыцьця. Зь вядомых раней лексэмаў прыводзяцца толькі тыя, якія набылі дадатковыя, пераважна пераносныя значэньні, або шырока ўжываюцца ў сучасных сродках масавае інфармацыі.

**Магілёўскі магістрат 1597—1598, 1599—1600, 1602—1603. Выпуск II / Аўтары-складальнікі А.А.Лашкевіч, З.Л.Яцкевіч.** — Мн.: БелНДІДАС, 2006. — Ч. 1. — 393 с.; Ч. 2. — 435 с.

Першы выпуск гэтага выданьня зьявіўся ў 1999 г. і гэтым самым запачаткаваў новую сэрыю «Беларусь у актавых кнігах XVI—XVIII стст.». Выданьне складаецца са сьпісу падрабязных загалоўкаў да кожнага дакумэнту актавых кнігаў — гэта значыць афіцыйных кнігаў магістрату і судовых органаў, а таксама з паказальнікаў. Звычайна падобная інфармацыя даступная толькі ва ўнутраных вопісах архіву. Цяпер жа зьвесткі пра зьмест гістарычных крыніцаў сталі даступнымі ўсім цікаўным. У магістраце, як і ў іншых урадавых і судовых установах Рэчы Паспалітае, вельмі дбайна вялося справаводзтва. Магілёўскі магістрат у гэтым сэнсе можа служыць своеасаблівым узорам для іншых гарадоў.

**Дернович, Сергей Д. Скандинавские древности эпохи викингов в Беларуси.** — Менск: Беларуская навука, 2006. — 86 с.: ил.

Кніга ўтрымлівае зусім невялікую нарацыйную частку, мэта выданьня — даць панараму знаходак скандынаўскіх старажытнасьцяў на тэрыторыі Беларусі. І гэта зроблена ў выглядзе каталёга, што складае амаль палову кнігі. У канцы I тыс. г. н.э. Заходняя, Цэнтральная і Ўсходняя Эўропа апынуліся ў зоне нарманскай экспансіі. У матэрыяльнай культуры Беларусі таксама знайшоў адлюстраваньне паўночнаэўрапейскі імпульс, які быў асабліва адчувальны ў IX—XI ст., калі прысутнасьць і дзейнасьць вікінгаў сталі тут вельмі значнымі. Аўтар робіць высནову, што вывучэньне археалягічных помнікаў дадзенага пэрыяду сьведчыць ня толькі пра складаны працэс балта–славянскага ўзаемадзеяньня, але і пра кантакты са скандынавамі.

**Алег Дзярновіч**

### Новая кніга Лакоткі

Выдавецтва «Беларуская навука» выпусьціла працу прафэсара Аляксандра Лакоткі «Гісторыка–культурныя ляндшафты Беларусі». Аўтар выявіў больш за 30 яркіх раёнаў, такіх, як Браслаўскі край на Віцебшчыне, Нясьвіскія prасторы на Меншчыне і Ціхая Бесядзь на Гомельшчыне. У кнігу ўключаны карты раёнаў, сьпіс помнікаў архітэктуры ў іх і рэкамэндацыі для турызму.

**МБ**

Паглядзіце на пінгвіна:
Ён закінуў ліст у скрыню.







Напісаў яго ён сам
Ласянятам-сябрукам.



Паштальён, паштальён,
Лістоў носіць ён мільён





Ды па розных адрасах -
Па лясах ды гарадах,

Часам нават па дрыгве -
Уяўляецца сабе!





Паштальён і не прыкмеціў -
Пабываў паўсюль у сьвеце!

Вось, нарэшце, адрасаты.
Ласяняты лісту рады!





Не марнуюць яны час -
Пішуць сябруку адказ.






http://www.tanakaland.org

Шкада толькі, доўга зноў
Трэба ім чакаць лістоў!

Капітан Танака ©

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

МОЦНЫЯ ДУХАМ

Лісьце падае долу, але праз жалюзі ня бачна
Ні новай зямлі, ні новага неба, хоць Касю мы і любім.
Праз гадзіну я выбегу да шапіка, на якім напісана «Смачна»,
Набуду хот-дог, цыгарэты і зноў маньячыцца буду.

Няхай «Кантра» як хвароба. Давай 5 на 5 на «трэйне».
Я вас парэжу нажом, тупыя няўмелыя боты.
Назаві сябе хоць Лукашэнкам, хоць Садамам Хусэйнам.
Я Дзед Талаш, пакаштуй куль з майго кулямёту.

І як бы мы ненавідзелі адно аднаго і колькі б
Разоў я цябе ні рэзаў нажом пасьля дымавухі
Заўтра мы будзем на Плошчы стаяць з табою поплеч
Загартаваныя воі свабоды, маладыя і моцныя духам.

*Чэпэл-Гіл, ЗША*

# Вера Рыч

50 гадоў творчай дзейнасьці.




**На дзень народзінаў перакладчыцу віталі ў Беларускім ПЭН-цэнтры.**

Сёлета спаўняецца 50 гадоў перакладніцкае дзейнасьці Веры Рыч. Зь беларускае мовы яе заахвоцілі перакладаць лёнданскія беларусы, дазнаўшыся, што яна перакладае з украінскае. Яе першы пераклад на ангельскую зь беларускае быў надрукаваны ў мюнхэнскай газэце «Бацькаўшчына» ў 1957 г., калі яе рэдагаваў Станіслаў Станкевіч.

Яна пераклала Купалу, Коласа, Арсеньневу, Багдановіча, Гаруна, Цётку, Геніюш, Бядулю, Крапіву, Іпатаву, Гілевіча.

У гэтыя дні шаноўная спн.Рыч перабывае ў Менску і Вільні.

**РМ**

**Вера Рыч (Vera Rich)**

нарадзілася 24 красавіка 1936 г. Беларускую вывучыла яшчэ ў школе. З 1960-х, поруч з асабістай творчасьцю, займалася перакладамі зь беларускае мовы. У прыватнасьці, паэзіі Коласа («Сымон-музыка»), Багдановіча, пераклала Вера Рыч і «Тараса на Парнасе». У 1971 г., праз дваццаць гадоў працы над беларускімі перакладамі, пад патранатам ЮНЭСКО выйшла першая ў сьвеце анталёгія беларускае паэзіі на заходняй мове «Like Water, Like Fire: An Anthology of Byelorussian Poetry from 1828 to the Present Day» («Як вада, як агонь: Анталёгія беларускае паэзіі ад 1828 г. да сучаснасьці»). Кнігу выдалілі з продажу ў Савецкім Саюзе з прычыны «непаліткарэктнасьці».

У 2004-м выйшаў новы зборнік беларускае паэзіі ў перакладзе Веры Рыч «Poems on Liberty: Reflections for Belarus» («Вершы на Свабоду: Роздумы пра Беларусь»). У 1970—90-я Вера Рыч шчыльна супрацоўнічала з дэмакратычнымі рухамі і рухамі ў абарону правоў чалавека ў Савецкім Саюзе і краінах-«спадарожніцах». Працавала ў Польшчы («Салідарнасьць») і Вугоршчыне.

Вера Рыч — ганаровы сябар Беларускага ПЭН-цэнтру, таксама яна ўзнагароджаная прэміяй імя Івана Франка (у гонар 40-гадовага служэньня ўкраінскай літаратуры), а сёлета была ўганараваная і ўкраінскім ордэнам Княгіні Вольгі.

## КАНЦЭРТ

**N.R.M.**

**30 красавіка а 19.30 у «Графіці»** (зав.Калініна, 16) адбудзецца акустычны канцэрт N.R.M., перанесены з 3 красавіка. Толькі 50 месцаў. Даведкі: 671–58–65.

## ІМПРЭЗЫ

**Гадавіна Чарнобылю**

**25 красавіка а 18-й на сядзібе БНФ** адбудзецца літаратурна-музычная вечарына, прысьвечаная гадавіне Чарнобыльскай катастрофы. Арганізатар імпрэзы — тэатар «ТыРады» і культурніцкая камісія Партыі БНФ.

**Прэзэнтацыя «МОСТу»**

**28 красавіка ў Доме-музэі Ваньковічаў** (вул.Інтэрнацыянальная, 33а) пройдзе прэзэнтацыя кнігі Цемрыка Велета «МОСТ». **Пачатак а 15-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВА

**Космас Івана Міска**

Адкрылася пэрсанальная выстава з нагоды 75-годзьдзя заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Івана Міска. Яго скульптуру, графіку і жывапіс можна пабачыць **у Мастацкім музэі** (вул. Леніна, 20) **да 14 траўня**.

**Рыцарскі фэст** **19—20 траўня**



# Меч Лідзкага замку

**У праграме**: рыцарскі турнір; «бугуртны турнір» — камандныя бугуртныя спаборніцтвы з прызавым фондам **500 у.а.**; «асада замку» — пастановачная бітва з элемэнтамі рэальнага бою; выкананьне сярэднявечнай музыкі і танцаў; вечаровая забаўляльная праграма ў рыцарскім лягеры ў замкавым двары.

**Кошт квіткоў:** 10 тыс. руб. Набыць іх можна ў Лідзе: у гісторыка-мастацкім музэі (вул.Перамогі, 37а, т. для даведак: (8–0156)12–13–91), раённым мэтадычным цэнтры народнай творчасьці (вул. Перамогі, 37а, т.: (8–0156)12–02–49), раённым Доме культуры (вул. Янкі Купалы, 1, т.: (8–0156) 12–53–92).

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

*на сцэне ЦДА*

**30 (пн)** — «Аіда».
**3 (чц)** — «Іялантa».

**Купалаўскі тэатар**

**28 (сб)** — «Вольга».
**27 (пт)** — «Маэстра».
**29 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**30 (пн)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**2 (ср)** — «Ромул Вялікі».
**3 (чц)** — «С. В.».
**4 (пт)** — «Вольга».
**5 (сб)** — «Вечар».
**6 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».

*ранішнія спэктаклі*

**29 (ндз)** — «Паўлінка».
**6 (ндз)** — «Сьнежная каралева».

*малая сцэна*

**27 (пт)** — «Адчыніце кантралёру!».
**28 (сб)** — «Баляда пра каханьне».
**30 (пн)** – «Варшаўская мэлёдыя».
**3 (чц)** — «Апельсінавае віно».
**5 (сб)** — «Адчыніце кантралёру!».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**27 (пт)** — «Адвечная песьня».
**28 (сб)** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**28 (сб)** — «Нязваны госьць».
**29 (ндз)** — «Чорны квадрат».
**2 (ср), 3 (чц)** — «Сталіца Эраўнд».
**4 (пт)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Лісты з Івадзімы»

**Лісты з Івадзімы** (Letters from Iwo Jima)

ЗША, 2006, каляровы, 141 хв.

**Рэжысэр:** Клінт Іствуд

**Ролі выконваюць:** Кен Ватанабэ, Казунары Ніномія, Цуесі Іхара, Рэ Касэ, Сіда Накамура, Хіросі Ватанабэ

**Жанр:** Вайсковая драма

**Адзнака:** 8 (з 10)

Прэміі «Оскар» і «Залаты глёбус»

Другая ўсясьветная вайна. Японская армія абараняе востраў Івадзіму. Калі амэрыканцы захопяць гэты пляцдарм, ім будзе адкрыты шлях да галоўных выспаў. Японскія жаўнеры адстрэльваюцца з каменных катакомбаў, але вынікі вайны прадвызначаныя…

«Лісты з Івадзімы» — другая частка дылёгіі Клінта Іствуда. «Сьцягі нашых бацькоў» распавядалі пра бітву вачыма амэрыканцаў, героі «Лістоў» — японцы.

Карціну можна параўнаць з творамі Быкава: стан трагічнае безвыходнасьці, канфлікт ідэалягічнага фанатызму й чалавечнасьці.

Попельна-зялёная гама пасуе не толькі «японскай гісторыі», але й быкаўскім вайсковым рэалізм, фінал прадказальны, дзеяньне нетаропкае — і зацягвае. Мы бачым «акопную праўду» вайны, прапагандысцкую гістэрыю — і годнасьць, насуперак забабонам.

Японскі генэрал, які прыехаў біцца за Івадзіму, — гэта мудры быкаўскі камандзір; пекар, які ня ведае, як трымаць вінтоўку, — просты беларускі хлапец. Ёсьць і сваё НКВД — тайная вайсковая паліцыя…

Але японская трагедыя — паводле Іствуда — адрозьніваецца ад быкаўскіх катастрофаў. *Памерці*, застаўшыся чалавекам, — адказны выбар быкаўскага герою, які выконвае свой апошні абавязак. І гэта для эўрапейца ліміт.

*Выжыць*, застаўшыся чалавекам, насуперак эпідэміі самазабойстваў, і выканаць свой абавязак — гэта ліміт для японца. Бо НКВДыст у кожнае галаве: ня выканаць загад адступаць, падарваць сябе гранатай, прымусіць падрывацца падначаленых (пакутліва-невыносная сцэна). І па-над усім гэтым — захаваныя лісты з жывымі галасамі людзей.

«Амэрыканскі самурай» Іствуд зрабіў карціну пранізьліва-гуманістычную.

Сапраўднае беларускае кіно паводле Васіля Быкава.

Карціна дэманстравалася ў Кінафармаце «4х4». **Сэансы з 23 да 29 красавіка ў менскім кінатэатры «Мір» а 18.40.**

**Андрэй Расінскі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## КАНЦЭРТ

**Канцэрт Тацяны Беланогай**

**27 красавіка** ў мастацкай галерэі Цэнтру народнай творчасці **ў памяшканьні бібліятэкі імя Пушкіна** (Гікалы, 4) засьпявае Тацяна Беланогая. Квіткі каштуюць 1600 рублёў. **Пачатак а 18-й.** Даведкі па т.: 293–06–60, 507–99–64.

**Калі б вэртыкаль і надалей сачыла за тым, каб выхаванцы дзіцячых дамоў ня бралі падарункаў ад Мілінкевіча.**

— Алё, таварыш маёр? Ваша заданьне выканана! Затрыманая падазроная асоба. Так, усе прыкметы супадаюць: барада і падарункі.




**Адміністрацыя забараніла дзіцячым дамам у чарнобыльскіх раёнах прымаць падарункі ад Аляксандра Мілінкевіча. Каб мець прычыну, дырэктаркі аб'явілі ў інтэрнатах каранцін... А.Мілінкевіч з 21 да 25 красавіка аб'ехаў Столін, Лунінец, Мазыр, Хойнікі, Брагін, Гомель, Слаўгарад, Чэрыкаў.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКІ САДОК

**Шукаем дзетак-дашкалятаў** для стварэньня беларускіх групаў зь верасьня на захадзе Менску (раёны Красны Бор—Сухарава—Захад), магчыма, ясельная і садаўская разнаўзроставая групы. Далучайцеся! З намі можна зьвязацца па тэл. 183–84–19, Лебедзі. Lebiedz@tut.by

### КАНТАКТЫ

**Падтрымайма** маладафронтаўцаў на судзе! Да Рымлянаў 8:31. Брат

**Zwiazek** szlachty polskiej. www.szlachta.org

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Сяргей Грахоўскі.** Выбраныя творы. 37–ы том кніжнага праекту «Беларускі кнізагбор» ужо ў продажы

**Упершыню** на ангельскай і беларускай мовах пабачыла сьвет кніга Васіля Быкава «Прыпавесьці». Пытайцеся ў незалежных распаўсюднікаў

**Набуду кнігі**: «Беларуская энцыкляпэдыя» 1–8, тэрмінова, дорага. Жодзіна, Заслаўе, матэрыялы археалягічных раскопак, гістарычная тэматыка, абмен матэрыялямі, інфармацыяй. Т.: 753–91–96

**DJ Адраджэньня** праводзяць нацыянальную віктарыну «Шоў Беларушчыны» ў менскіх школах і ВНУ. Замаўляйце! Т.: 694–82–80

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

### ВАЗОК

**Набудзем** вазок для немаўляці. Т.: 8–029–766–12–79. Зьмітрусь

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 6 траўня (нядзеля) па маршруце: Менск — Глыбокае — Удзела — Мосар — Слабодка — Браслаў — Опса — Відзы — Друя — Менск. 18—21 траўня: Торунь — Хелмна — Голюб-Добжынь. Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509–12–16.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне **«Таварыства беларускай школы»** аб'яўляе конкурс на ўдзел у міжнародным беларуска–польскім праекце **«Народны альбом»**. Рэпэтыцыі і паказы спэктакля адбудуцца ў Беларусі і Польшчы (Закапанэ, Гданьск, Варшава) падчас летніх вакацый.

На конкурс запрашаюцца навучэнцы 8 — 10 класаў, якія маюць акторскія і вакальныя здольнасьці.

Ахвотных узяць удзел у конкурсе запрашаем тэлефанаваць: 692–55–13, 333–15–56

## КУР'ЁЗ

# Скралі аэрастат

Кур'ёзная гісторыя адбылася на 14–ай спэцыялізаванай выставе «Tibo». У ноч на 25 красавіка невядомыя скралі... аэрастат. Лятальны апарат быў прывязаны на даху футбольнага манежу, дзе праходзіла выстава, і лунаў на вышыні трыццаці мэтраў.

Шасьцімэтровы аэрастат у неба запусьціла беларуская інтэрнэт–кампанія «Адкрыты кантакт», на мэце мелася рэкляма гэтай кампаніі.

Цэлы дзень пад павевамі ветру аэрастат кружляў у небе, прыводзячы ў захапленьне гасьцей выставы і мінакоў. Вечарам прадстаўнікі «Адкрытага кантакту» хацелі занесьці аэрастат у будынак, але ахова запэўніла, што нічога кепскага з шарам ня здарыцца, няхай застаецца на даху.

Ноччу ж нехта адмыслова абрэзаў замацавальныя тросы і аэрастат паляцеў у невядомым накірунку. Кажуць, што найхутчэй на Захад. У «Адкрытым кантакце» шкадуюць, што аэрастат паляцеў ня днём. Хоць бы дзеці парадаваліся.

Шукаць аэрастат яго ўладальнікі не зьбіраюцца, але спадзяюцца, што хто–небудзь і патэлефануе, каб паведаміць пра ягонае месцазнаходжаньне. Пакуль пра тое, дзе цяпер аэрастат, ня ведаюць нават вайскоўцы.

**ЗП; інф. БелаПАН**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Ня вельмі даўно ў нас было сьледзтва па дзелу аб вучыцельскім саюзе. З вучыцялёў, што да таго саюзу належалі, узялі падпіску, каб нікуды не выяжджалі без дазваленьня паліцыі. Абвіняюць па 126 ст. па першай часьці. Яшчэ ня зьнялі дапросу са ўсіх сяброў. Улетку, як відаць, будзе суд.

**Я.К. «Наша Ніва» № 15, 1907**

**Наша Ніва**
**незалежная газэта**

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2241. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.04.2007.
Замова № 2287.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.